**СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!**

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II КВАРТАЛ і І ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.
*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | I квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 | 74400 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 | 69600 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 | 119400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 | 108000 |

*Заставайцеся з намі!*



WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 САКАВІКА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 41 (26905)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


## Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў афіцыйныя геральдычныя сімвалы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Віцебскай вобласці

Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 28 лютага.

Дакументам уводзяцца афіцыйныя геральдычныя сімвалы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Віцебскай вобласці — гербы і сцягі Віцебскага раёна, гарадскіх пасёлкаў Бягомль Докшыцкага раёна, Балбасава Аршанскага раёна, Лынтупы Пастаўскага раёна, Арэхаўск Аршанскага раёна; сцягоў горада Верхнядзвінска і Верхнядзвінскага раёна, горада Гарадка і Гарадоцкага раёна, горада Докшыцы і Докшыцкага раёна, горада Талачына і Талачынскага раёна, гарадскога пасёлка Ушачы і Ушацкага раёна, горада Дуброўна.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## Інтэграцыя ў Саюзнай дзяржаве павінна быць напоўнена канкрэтнымі эканамічнымі праектамі

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Паўлам Барадзіным, перадае БЕЛТА.**

«Наперадзе вельмі важныя мерапрыемствы: 15 сакавіка ў Мінску адбудзецца чарговае пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. «Мы надаём вельмі важнае значэнне гэтаму мерапрыемству, і мне было прыемна, што актыўна рыхтуецца да яго і расійскі бок». Ён таксама паведаміў, што акрамя планавага парадку дня ёсць яшчэ пакет дакументаў, падпісанне якіх прымеркавана да пасяджэння Саюзнага Саўміна. Гэта міжурадавыя пагадненні, якія датычацца будаўніцтва АЭС, дакументы, звязаныя з выкарыстаннем космасу ў мірным мэтах, а таксама дакументы па даследаваннях у Антарктыдзе. Запланавана падпісанне і шэрагу пагадненняў на ўзроўні міністэрстваў і ведамстваў.

«Трэба будзе абмеркаваць многія пытанні. Але, галоўнае, — напоўніць супрацоўніцтва канкрэтнымі эканамічнымі праектамі. Не проста чарговы раз запэўніць, што саюзныя адносіны — гэта важна і патрэбна. Гэта павінна быць эканоміка. Будзе працаваць эканоміка — будзе і ў астатніх сферах усё нармальна», — лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Парламенцкі дзённік

## НАМЕРЫ ЗАСТАЮЦЦА

### Беларускія парламентарыі падкрэсліваюць, што размова пра згортванне супрацоўніцтва з АБСЕ не ідзе

**Міжнародны рэзананс вакол паслявыбарчых падзей у Беларусі, закрыццё офіса АБСЕ ў Мінску... Усё паказвала на тое, што ўдзел нашай дэлегацыі ў рабоце парламенцкай асамблеі арганізацыі гэтай зімой будзе самым што ні на ёсць гарачым. Як трымалі «ўдар» і на што арыентуюцца ў будучым, расказалі беларускія парламентарыі па вяртанні з Вены. Там у канцы лютага прайшла 7 зімовая сесія ПА АБСЕ.**

**Выбары асобна, беспарадкі асобна**

Самым, бадай, палемічным атрымалася пасяджэнне камітэта па дэмакратыі, правах чалавека і гуманітарных пытаннях. Шэраг еўрапейскіх парламентарыяў выступілі з дакладам па сітуацыі ў Беларусі. Самы вялікі напор беларуская дэлегацыя, паводле яе прызнання, адчула з боку ЗША, Германіі і Польшчы. Маўляў, выступленні астатніх былі «больш прагматычнымі».

— У нас склалася ўражанне, што дакладчыкі, нягледзячы на тое, што выказвалі шмат прэтэнзій да правядзення выбараў у Беларусі, пачыналі з пазітыву, кожны спрабаваў неяк змякчыць сваё выступленне, — дзеліцца кіраўнік беларускай дэлегацыі **Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў**.

Для сябе ён тлумачыць такія захады дакорамі сумлення, выклікаными прымяненнем двайных стандартаў. Маўляў, пра сітуацыю ў Албаніі гутарка ішла абсалютна ў іншым стылі.

— Аб'ектыўнай ацэнкі не было дадзена, — дадае віцэ-спікер. — Доказы былі пабудаваныя перш за ўсё не на аб'ектыўнасці, а на эмоцыях.

Фундаментальную ж памылку еўрапейскіх калег беларускі парламентарый бачыць у тым, што яны злучылі ацэнку правядзення выбараў у Беларусі з тым, што адбылося пасля іх, чаго, на яго думку, рабіць нельга: «Гэта дзве абсалютна розныя дзеі». І беларускую пазіцыю, паводле яго слоў, падтрымалі расійская і армянская дэлегацыі, а таксама член рабочай групы па Беларусі — італьянскі парламентарый Клаўдыа Д'аміка. Ён заклікаў прысутных падзяліць гэтыя два пытанні.

— І мы лічым, што павінна быць дзве ацэнкі, — акцэнтуе В. Гумінскі, — мы рабілі ўпор менавіта на гэта.

Паводле яго слоў, беларуская дэлегацыя брала актыўны ўдзел у рабоце пасяджэння, даводзіла сваю пазіцыю па абедзвюх частках. Адносна правядзення саміх выбараў у Беларусі, паводле яго слоў, зроблена насамрэч шмат станоўчага. Практычна ўсе прапановы АБСЕ рэалізаваныя заканадаўча. Спадар Гумінскі адзначае, што ідэальных выбараў няма, і прызнае, што «магчыма, і ў нас былі парушэнні». Аднак выбары прайшлі ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і перагляду не падлягаюць. Дарэчы, паводле яго слоў, ніхто падобнага пытання і не ставіў. «Гэта сведчыць пра тое, што яны згодныя ў тым, што выбары ў Беларусі прайшлі ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і палажэннямі той жа Венецыянскай камісіі». І ў гэтым кірунку беларускі бок гатовы і надалей супрацоўнічаць з АБСЕ па ўдасканаленні выбарчага працэсу. Хоць у самой Еўропе, паводле звестак беларускага парламентарыя, няма адзінай метадалогіі ацэнкі выбараў, — «усё гэта ўмоўна».

СТАР. 2


АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Частного производственного унитарного предприятия «Борисовский комбинат текстильных материалов Белкоопсоюза» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже **складского комплекса**, расположенного по адресу: **Минская обл., Борисовский р-н, район д. Ланковщина**, в составе: склад (инв. № 610/С-6530) об. пл. 9929,8 кв.м; подъездной железнодорожный путь (инв. № 610/С-49964); мехмастерская складских помещений (инв. № 610/С-38582) об. пл. 125 кв.м; трансформаторная подстанция (инв. № 610/С-38630) об. пл. 28 кв.м; административно-бытовой корпус (инв. № 610/С-536) об. пл. 798 кв.м; водонапорная башня складских помещений (инв. № 610/С-532); насосная складских помещений (инв. № 610/С-537) об. пл. 84 кв.м; подстанция складских помещений (инв. № 610/С-38620) об. пл. 50 кв.м; котельная складских помещений (инв. № 610/С-49868) об. пл. 254,8 кв.м; проходная складского хозяйства (инв. № 610/С-38623) об. пл. 23 кв.м.

**Начальная цена с НДС – 3 619 788 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка: 3,1626 га; 0,3328 га; 0,2003 га.**

**Задаток в сумме 100 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **05.04.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.04.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


Жывая зямля

## Іван Іванавіч гукае вясну... Семдзесят чацвёртую



**ШПАКОЎНІ дзеда Івана бачныя здалёк. У Прылепах яны — як маяк. Хацеў яшчэ вышэй падняць, каб птушкам спакойней гасцілася, дык вышэйшых жэрдак не знайшоў (гэтыя па 5-6 метраў).**

— Памятаю, у дзяцінстве сусед прыцягнуў з лесу тонкае дрэва ажно ў 24 метры і падняў на ім шпакоўню. Вось гэта была вышыня! — прыгадвае калгасны пенсіянер і птушыны фанат Іван Іванавіч Кірыльчык.

Тры з паловаю дзясяткі гадоў гэты птушкалюб адпрацаваў будаўніком: тутэйшыя калгасныя фермы і вясковы клуб узводзіліся і яго рукамі. А што ўжо ён майстар па гаспадарцы! Саначкі зрабіць, кошыкі сплесці, не кажучы пра шпакоўні — звычайныя для яго рэчы. 10 гадоў Іван Іванавіч жыве гэтым дзіўным чаканнем. Як толькі сонейка павярнула на лета, не-не, ды і кідае позірк на шпакоўні, хоць ведае, што пакуль ранавата сустракаць сяброў. Яму дужа падабаецца, як птушкі спяваюць, як увіхаюцца, калі кормяць сваіх птушанят. Нават сцеражэ шпакоўні ад варон, пакуль малыя не падрастуць. Гэтыя шпакоўні ўдзельнічалі нават у здымках кінафільма. Для стварэння ілюзіі вёскі ў кінафільме «Нямко» спатрэбіўся розны вясковы антураж, і Кірыльчыкавы шпакоўні сталі сапраўды неад'емнаю часткай кінастужкі. Фільм здымалі ўвосень, таму вясною птушыныя хаткі зноў з'явіліся на сваім ранейшым месцы. Ад таго часу дзед Іван свой шпачыны «кааператыў» не турбаваў.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.** *Смалявіцкі раён.*

## Выплата пенсій пачнецца з 4 сакавіка

**У Беларусі графік выплаты пенсій скарэкціраваны ў сувязі са святкаваннем Дня жанчын, паведамілі БЕЛТА ў РУП «Белпошта».**

Так, тэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 8 сакавіка ў сельскіх аддзяленнях паштовай сувязі (АПС) Брэсцкай вобласці пачнецца з 4 сакавіка. Ва ўсіх АПС горада Мінска, Віцебскай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, у гарадскіх АПС Брэсцкай вобласці і сельскіх АПС Гродзенскай вобласці выплата пенсій будзе ажыццяўляцца з 5 сакавіка, а ў гарадскіх аддзяленнях паштовай сувязі Гродзенскай вобласці — 7 сакавіка.

Блізкая ўлада

## У ПОШУКАХ КАМПРАМІСАЎ І ПРАВІЛЬНЫХ РАШЭННЯЎ

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК** 2 сакавіка разгледзеў на прыёме дзясятак зваротаў грамадзян, якія датычыліся самых розных праблем — ад стварэння ў Магілёве Дома рамёстваў да пабудовы каналізацыі ў прыватным сектары.

**Магілёўскі рамеснік Аляксандр ЦІМАХОВІЧ просіць** улады падтрымаць яго ідэю і **стварыць у абласным цэнтры Дом рамёстваў**, дзе народныя майстры маглі б вырабляць і прадаваць свае работы.

— Калі можна будзе рабіць больш, то можна будзе прадаваць вырабы рамеснікаў у Расіі, дзе яны высока цэняцца, — пераконваў Цімаховіч.

Майстру, які займаецца глінай, падаецца, што падтрымка ўлад пакуль недастатковая, у радах рамеснікаў няма адзінства і мала моладзі, якой трэба перадаваць свае веды. Напрыклад, Цімаховіч занепакоены бондарствам: майстроў у гэтай галіне мала, а экалагічна чыстыя бондарскія вырабы, драўляныя бочкі і кадушкі, як экалагічна чыстая прадукцыя, карыстаюцца вялікім попытам.

— Мы шмат робім для падтрымкі народных рамёстваў, але, відаць, усё ж недастаткова і можам зрабіць больш, — сказаў Пётр Руднік. Кіраўнік вобласці пагадзіўся, што прапанова заяўніка па стварэнні ў Магілёве Дома рамёстваў слушная.

СТАР. 2

## У Беларусі выдадзена больш за 85 тысяч пасведчанняў новага ўзору

**Аб гэтым журналістам паведамілі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі.**

Выдаваць пасведчанні кіроўцаў міжнароднага ўзору ў нашай краіне падраздзяленні ДАІ пачалі з 1 лютага гэтага года. Паводле слоў **старшага інспектара УДАІ МУС Беларусі Дзмітрыя ГАРЫНОВІЧА**, за месяц па рэспубліцы выдадзена больш як 85 тысяч новых дакументаў. Асноўная іх колькасць прыйшлася на жыхароў горада Мінска і прымежных тэрыторый краіны — Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

— У Расіі выдача пасведчанняў новага ўзору пачалася на месяц пазней, чым у нас, — з 1 сакавіка гэтага года, — адзначыў Дзмітрый Гарыновіч. — Прычым, калі параўноўваць кошт, то пасведчанне новага ўзору ў Беларусі абыдзецца ў 17. 500 беларускіх рублёў, у Расіі ж — каля 80 тысяч у пераліку на беларускія рублі.

Намеснік начальніка УДАІ МУС Максім ПАДБЯРОЗКІН падкрэсліў, што ніякіх чэргаў у падраздзяленнях ДАІ у сувязі з заменай пасведчанняў няма.

**Надзея ДРЫЛА.**

«Прамая лінія»

## СУСТАЎ ПАТРАБУЕ ЗАМЕНЫ

Пра дыягностыку і лячэнне дэгенератыўна-дыстрафічных захворванняў буйных суставаў (каленнага, тазасцегнавога, галёнкаступнёвага) — артрозаў, застарэлых пераломаў і вывіхаў, астэапарозных пераломаў можна распытаць **загадчыка кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктара медыцынскіх навук Алега Пятровіча КЕЗЛЮ**. Рэдакцыйная «прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца **15 сакавіка, у аўторак, з 15.00 да 16.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакідаць па нумарах: **8 (017) 287 18 29 і 287 18 36**.

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## БЕЛАРУСЫ АТРЫМАЮЦЬ НОВЫЯ РУБЛІ

### Хутка ў абарачэнні з'явяцца мадыфікаваныя банкноты «старых» грошай

**Каб узмацніць ступень абароны нацыянальнай валюты, Нацыянальны банк з 15 сакавіка ўводзіць у абарачэнне шэраг новых мадыфікаваных банкнот розных наміналаў узору 2000 года.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацбанка Міхаіл Жураковіч, узмоцнены ахоўныя адзнакі і ўдасканалены элементы аховы на банкнотах наміналам 500 рублёў, 1000 рублёў, 10000 рублёў і 20000 рублёў узору 2000 года. Прычым відарыс пярэдняга і адваротнага бакоў, каляровая гама і памер новых мадыфікаваных банкнотаў засталіся такім ж, як і ў банкнотаў адпаведнага наміналу ўзору 2000 года. Што ж датычыцца адрозненняў, то ў новых банкнотах замест палімернай празрыстай ніткі з тэкстам «НБРБ» у прамым і перавернутым адлюстраванні ў паперу ўведзена металізаваная ахоўная нітка, што нырае, з участкамі, якія выходзяць на паверхню банкнота ў выглядзе бліскучых прамавугольнікаў, што ўтвараюць пункцірную лінію. Пры разгляданні банкнота на прасвет ахоўная нітка мае выгляд скразной цёмнай паласы. Як адзначылі ў галоўным банку краіны, банкноты Нацыянальнага банка ўзору 2000 года вышэйзгаданых наміналаў разам з мадыфікаванымі банкнотамі застаюцца ў абарачэнні.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## У ІНТЭРНЭЦЕ МІНЧАНЕ СЁЛЕТА ЗАРАБІЛІ БОЛЬШ ЗА 2,2 МЛРД РУБЛЁЎ

**Як паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах Беларусі, па стане на першы дзень вясны жыхарамі Мінска было задэкларавана больш за 2,2 млрд рублёў даходаў, якія былі атрыманы сёлета праз сеткі інтэрнэт. З гэтых даходаў бюджэт краіны атрымаў падаходны падатак у памеры больш за 240 млн рублёў.**

У прэс-цэнтры МПЗ адзначылі, што ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, сёлета атрыманы даход праз сеціва павялічыўся ў 10 разоў. Каля 40 працэнтаў прыватных дэкларантаў такіх даходаў зарабілі свае грошы ў інтэрнэт-гульнях (покер, інтэрнэт-казіно і іншыя). Іх агульны заробак склаў больш як мільярд рублёў. Амаль трэць дэкларацый падаткавікам падалі асобы, якія выконвалі розную віртуальную працу ў сетцы і зарабілі на гэтым больш як 770 млн рублёў. Чвэрць паспяховых работнікаў сеткі інтэрнэт зарабілі 481 мільён рублёў ад аперацый на рынку «Форэкс» і па сістэме грашовых пераводаў на электронныя кашалькі.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

## РАКАВАЯ ПАЕЗДКА

**Чацвёра хлопцаў у Мінску трапілі ў аварыю, у выніку якой двое з іх загінулі.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, ДТЗ адбылося на пачатку другой гадзіны ночы на вуліцы Валгаградскай, а за рулём аўтамабіля «Форд Сіера» знаходзіўся 17-гадовы юнак, які, дарэчы, не меў вадзіцельскага пасведчання. Ён не справіўся з кіраваннем, і машына выехала за межы праезнай часткі і ўдарылася ў асвятляльную мачту, пасля чаго аўтамабіль адкінула на дрэва. У выніку ДТЗ кіроўца загінуў на месцы, а другі малады чалавек, 1994 года нараджэння, памёр па дарозе ў бальніцу. Яшчэ двое пасажыраў аўтамабіля, хлопцы 1990 і 1992 года нараджэння, атрымалі траўмы і былі шпіталізаваныя ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*


АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СлуцкОблГарант» (продавец)**

проводит очередной открытый аукцион по продаже **одноэтажного кирпичного здания РТМ**, об. пл. 267,2 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, д. 19.**

**Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 110 369 860 бел. руб.**

**Задаток – 20 000 000 бел. руб.**

*Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.12.2010.*

Аукцион состоится **10.03.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.03.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


Абітурыент БДУ—2011

## Выпускнікоў школ — менш, а шанцаў — больш

**«Стань студэнтам БДУ ў юбілейны год!» — менавіта пад такім дэвізам будзе праходзіць сёлетняя прыёмная кампанія ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, які напрыканцы кастрычніка адзначыць сваё 90-годдзе.**

Нягледзячы на змяншэнне колькасці выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, якое назіраецца ў нашай краіне два апошнія гады, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт свой план прыёму на першы курс змяншаць не плануе. Аб гэтым учора на сустрэчы з журналістамі паведаміў **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА**: «Мы вельмі спадзяёмся, што дэмаграфічны спад не закране наш універсітэт. І ў нас не будзе праблем з запаўненнем месцаў».

Усяго ў бягучым годзе на дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУ плануецца набраць каля 2100 чалавек і 2700 чалавек — на дзённую платную форму навучання. На завочнай форме навучання за кошт сродкаў бюджэту будуць навучацца 420 чалавек і 1290 чалавек — за ўласныя сродкі. План набору на завочную форму навучання для атрымання другой вышэйшай адукацыі складае 535 чалавек. Таксама плануецца прыняць больш як 400 замежных грамадзян для навучання на першай і другой ступені вышэйшай адукацыі.

З 2011 года Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адкрывае прыём на тры новыя спецыяльнасці і пяць новых напрамкаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Жарсці па Еўрабачанні

Анастасія ВІННІКАВА:

## «КАР'ЕРУ СПЯВАЧКІ МНЕ ПРАДКАЗАЎ СВЯТАР»



**Яшчэ ўчора яе прозвішча ніхто не ведаў — простая студэнтка і спявачка, у творчым багажы якой толькі пяць песень. Сёння Анастасію Віннікаву даволі бурна абмяркоўваюць у інтэрнэце, музычных і журналісцкіх колах. Цікавяцца ўсім: што яна чытае, ці ёсць у яе хлопец, якую музыку слухае. Анастасія Віннікава з песняй «Born in Belorussia» будзе прадстаўляць Беларусь на «Еўрабачанні-2011». Наперадзе тры месяцы напружанай падрыхтоўкі, а пакуль яна, як звычайная студэнтка, наведвае лекцыі і кожны дзень ездзіць на электрычцы дадому ў родны Дзяржынск.**

***Цалкам інтэрв'ю з Анастасіяй ВІННІКАВАЙ чытайце ў наступным нумары «Звязды».***

Шчасце, калі ў доме Гаспадар

## «НІЧОГА НЕ РОБІЦЬ ЧАЛАВЕКА ТАКІМ ДОБРЫМ, ЯК ЗНОСІНЫ З ЖЫВЁЛАЙ»

### У гэтым пераканаены чарговы герой нашай рубрыкі — фермер з-пад Ракава

Надзея ДРЫЛА

**Хоць статус фермера дырэктар адной з гандлёвых сетак Мінска атрымаў нядаўна, ён, пераканалася, аднолькава камфортна адчувае сябе як у дзелавым касцюме і начышчаных да бляску чаравіках, так і ў ватоўцы і валёнках... Скажу больш: для Аляксандра Сталярскага не выклікае цяжкасці і падкаваць каня. І нават укол сваім гадаванцам, калі трэба, зробіць не горш за спецыяліста. Адным словам, добра ведае, і самае галоўнае, любіць сваю справу. І не дзіўна: коньмі гэты, дазвольце заўважыць, гарадскі (!) чалавек цікавіцца настолькі даўно, колькі сябе памятае.**

### Гадаванцы Сталярскага здымаліся ў «Масакры» і забіралі з ЗАГСа тэнісіста Максіма Мірнага

Пакуль іншыя хлопцы ганялі мяч па полі, Саша вазіўся з суседскімі «сіўкамі». Апошніх, балазе, у той час у Мінску было хоць адбаўляй. Уласнага ж каня змог сабе дазволіць толькі пасля заканчэння інстытута, дзе ён, дарэчы, нават дыпломную абараняў па конях.

— Набыў яго ў чалавека, які займаўся зборам другаснай сыравіны. Той узяў з мяне грошай як за вельмі добрага каня. Толькі пасля высветлілася, што Чалы як агню баяўся вялікіх машын. Расказвалі, што пасля таго, як ён разбіў машыну ў горадзе, гаспадар і вырашыў пазбавіцца ад праблемнага гадаванца. Тым не менш, нягледзячы ні на што, мы з Чалым адразу ж паладзілі.

СТАР. 4



ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.03.2011 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 020,00 | 1 чэшская крона | 170,92 |
| 1 еўра | 4 158,24 | 1 польскі злоты | 1 047,12 |
| 1 латвійскі лат | 5 903,63 | 1 расійскі рубель | 105,49 |
| 1 літоўскі літ | 1 205,61 | 1 украінская грыўня | 380,04 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 28,6277 |
| 10 UAH | 36,0323 |
| 1000 BYR | 9,4762 |
| EUR | 39,3974 |

### Прэзідэнт павіншаваў Міхаіла Гарбачова

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Міжнароднага грамадскага фонду сацыяльна-эканамічных і паліталагічных даследаванняў Міхаіла Гарбачова з 80-годдзем.

«Перакананы, што Вашы высокі аўтарытэт, багаты жыццёвы вопыт, прынцыповая грамадзянская пазіцыя будуць і ў далейшым садзейнічаць умацаванню міру і ўзаемаразумення народаў, пашырэнню ўсебаковых беларуска-расійскіх адносін», — гаворыцца ў віншаванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ЧАЛАВЕК-ЭПОХА

**Міхаіл Гарбачоў адзначыў сваё 80-годдзе. За апошнія 10 гадоў адносіны да гэтага чалавека ў большасці расіян памяняліся. Ад негатыўных да абыякавых. Пра гэта сведчаць даследаванні Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай меркавання. «Калі раней нашы суграмадзяне былі схільныя выпрабоўваць да гэтага дзеяча непрыязнасць, то сёння большасць апытаных адносіцца да яго абыякава, — рэзюмуе вынікі перадюбілейнага апытання УЦВГМ. — Галоўным дасягненнем эпохі праўлення Гарбачова лічыцца, у першую чаргу, увядзенне дэмакратычных свабод, а самай галоўнай памылкай — распад СССР».**



Што думаюць пра гэта беларусы, украінцы і літоўцы — невядома. Але здагадацца можна.

Дарэчы, Гарбачоў — апошні наш агульны кіраўнік. Таму варта было б спытаць у грамадзян усіх 15 маладых дзяржаў.

Для мяне асабіста Гарбачоў пачаўся з прамовы дырэктара школы на выпускным вечары ў 1987 годзе. Ён сказаў, што ў нас наперадзе вельмі цікавае жыццё, бо мы ўступаем у самастойны шлях, у эпоху перабудовы, і што ад нас шмат чаго будзе залежыць. Гэта была эпоха нашага юнацтва. Гэта была эпоха Гарбачова. Таму мне, напэўна, цяжка адчуваць да гэтага чалавека негатыўныя эмоцыі. Мы былі шчаслівыя. Мы адчувалі, што ўсё мяняецца. Нарэшце. І што мы, маладыя, прымаем у гэтых пераменах самы непасрэдны ўдзел.

Не, мы не аналізавалі і не надта задумваліся, дрэнна ці добра тое, што мяняецца. Мы проста глядзелі шырока расплюшчанымі вачыма на тое, што адбывалася вакол. Мы ўдыхалі поўнымі грудзьмі свежае паветра. Часам гэта было халодна, знішчальныя скразнякі, але маладыя скразнякоў не баяцца.

Тады многае было ўпершыню. І многае — у апошні раз. Нам казалі на лекцыях па гісторыі КПСС, што перамога ў Вялікай Айчыннай вайне была не дзякуючы, а насуперак палітыцы Сталіна. Упершыню. І гэта слова «насуперак» назаўсёды засталося ў памяці. Памятаю, як з жахам пачула на адной з гарадскіх кухань нядобрыя словы пра Леніна. Упершыню. На канікулах мы з'ездзілі на электрычцы ў Вільню. Вось так, проста — у апошні раз.

Мы не надта ўнікалі ў палітыку, не былі актывістамі тых або іншых рухаў, але ў маім сямейным архіве ёсць некалькі фатакартак, зробленых «Зенітам», якія цяпер можна лічыць гістарычнымі...

Нам сапраўды было цікава. Свабода... Мы прымяралі яе, як сукенку. Мы не выходзілі з вагона электрычкі на апошняй станцыі метро, мы спрабавалі ўзбегчы дагары па эскалатары, які ідзе ўніз, мы гулялі па раздзяляльнай паласе праспекта Леніна... Гэта потым ён стаў праспектам Незалежнасці.

Мы кахалі, вандравалі, сумавалі, расчароўваліся... А тым часам руйнавалася Берлінская сцяна, спынялася «халодная вайна», адраджаліся храмы, уводзіліся талоны на харчаванне, спыняліся заводы, заключаліся новыя міжнародныя дамоўленасці, пераставалі існаваць старыя...

Мяне заўсёды краналі адносіны Гарбачова да Раісы Максімаўны. Яны былі прыгожай парай. Падобныя рэчы варты павагі.

Сацыёлагі адзначаюць, што стаўленне да Гарбачова мяняецца не толькі ў залежнасці ад таго, да якога пакалення або да якой партыі належаць апытваемыя, але і з цягам часу. Добра, што людзі схільныя дараваць. Мне б хацелася, каб дзед мой, ветэран, які яшчэ жывы, таксама дараваў, але гэта наўрад ці... І вось гэта адзінае, вельмі важнае, што муліць душу, быццам дзед мой крыўдуе не толькі на апошняга кіраўніка вялікай краіны, якую ён страціў. Але і на мяне, грамадзянку іншай краіны, імя якой Рэспубліка Беларусь, таксама.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Минский райисполком отказывается от проведения аукциона 10 марта 2011 года в отношении Лота № 7,**
земельного участка площадью 0,2063 га,
расположенного по адресу:
Минский район, Папернянский с/с, д. Лапоровичи
в связи с ненадлежащим состоянием земельного участка.
УНП 600068187.

**Утерянный филиалом Белгосстраха** по г. Минску бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 0632495 **считать недействительным**.
УНП 101883943

# У ПОШУКАХ КАМПРАМІСАЎ І ПРАВІЛЬНЫХ РАШЭННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хоць і цяпер праблем з развіццём у рамеснікаў няма. Ім прапануюць свабодныя плошчы і абсталяванне на фабрыцы мастацкіх вырабаў, а ўсю іх прадукцыю гатовы прыняць на продаж у этнаграфічным музеі. **Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Станіслаў БАРАДАЎКА** пажадаў гарадскім рамеснікам аб'яднацца ў грамадскую арганізацыю, з якой можна было б весці перамовы аб падтрымцы майстроў і, у прыватнасці, аб стварэнні Дома рамёстваў, які павінен працаваць на ўмовах гаспадарчага разліку.

Да старшыні Магілёўскага аблвыканкама **з просьбай дапамагчы вярнуць доўг звярнуўся кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі «Час наперад» Ігар МАЛАШКЕВІЧ**. Гэта гаспадарка працуе ў Краснапольскім раёне два гады, і ў тым ліку летась паставіла сыравіну на дрэваапрацоўчае прадпрыемства «ФанДок». Але грошы ў суме больш за 40 мільёнаў рублёў фермеру дасюль так і не заплацілі.

Пётр Руднік прасіў Ігара Малашкевіча зрабіць высновы з гэтай гісторыі і ў будучым не задавольвацца вуснымі запэўніваннямі кіраўніка разлічыцца, а браць пісьмовыя гарантыі, якія ў спрэчнай сітуацыі можна прад'явіць у гаспадарчым судзе.

Між тым, на «ФанДоку» з'явіўся новы дырэктар, які ўзяў абавязацельства да 1 красавіка вярнуць пастаўшчыку сыравіны запазычанасць. На прадпрыемстве цяпер прымаюць меры, каб разлічыцца з усімі, каму вінны грошы, і агульная сума немалая — каля мільярда рублёў.

Аднак і ўлады, паспрыяўшы сустрэчы фермера і прамыслоўца, папрасілі Ігара Малашкевіча зрабіць ласку ў адказ. Гаспадарка два гады таму атрымала 90 гектараў зямлі, але араць яе так і не пачала. Фермер абяцаў сёлета выправіцца.

Дадатковага разгляду патрабуе **заява бабруйскага прадпрымальніка Уладзіміра ХІТРАКОВА**, якому мясцовыя ўлады адмовілі ў просьбе **перавесці жылое памяшканне ў нежылое для стварэння ў ім цырульні**. Каб зрабіць усё паводле закона, давядзецца звярнуцца і ў Мінск. Справа ў тым, што спрэчнае памяшканне знаходзіцца ў цэнтры горада, у яго гістарычнай забудове сярэдзіны мінулага стагоддзя. І хоць дом не з'яўляецца значным помнікам архітэктуры, але ў Бабруйску маюць намер захаваць некалькі ўчасткаў старой забудовы, каб горад меў сваё адметнае аблічча.

Прадпрымальнік настойвае, што няма законных перашкод для яго праекта, які нечакана забуксаваў на самай апошняй стадыі. Бабруйскія ўлады лічаць, што «шанхай» з крамаў і цырульняў не ўпрыгожыць цэнтр горада. Пакуль бакі не прыйшлі да адзінага меркавання, а Пётр Руднік лічыць, што неабходны дадатковы разбор.

Як, дарэчы, і ў справе **кіраўніка сялянска-фермерскай гаспадаркі Анатоля СІКОРСКАГА з Дрыбінскага раёна**. Ён некалькі гадоў таму ўзяў у арэнду сажалку «Запольскую» і развёў у ёй рыбу, але выявілася, што там водзіцца від ракаў, які занесены ў Чырвоную кнігу. Існаванне тых каштоўных ракаў несумяшчальнае з прамысловым развядзеннем рыбы. Як адшукаць кампраміс?

Фермер цяпер клапоціцца, **каб не страціць грошы, выдаткаваныя на развядзенне рыбы**. На гэты конт будзе працаваць спецыяльная камісія, але ўжо цяпер Анатолю Сікорскаму прапануюць арандаваць іншую сажалку, а таксама браць удзел у новым абласным праекце па вырошчванні фарэлі. Фермер упэўніўся, што ўлада не абыдзе ўвагай яго інтарэсы.

— Я да вас прыйшоў ад народа, — аб'явіў кіраўніку вобласці **Аляксандр Восіпавіч КУРАШОЎ, пенсіянер** і ўдзельнік вайны з Японіяй.

Ён расказаў, што жыхары дамоў на завулку Асеннім у Магілёве мараць пра тое, **каб у сезоннае бездарожжа дабірацца да прыпынку грамадскага транспарту і крамы не па гразі**, а па асфальтаванай дарожцы.

У Магілёўскім гарвыканкаме не паабяцалі асфальтаваць усю дарогу праз прыватны сектар, але ўвесну падсыпаць яе асфальтавай крошкай — абавязкова. Акрамя гэтага, Пётр Руднік даручыў пашукаць магчымасць усё ж зрабіць нармальную пешаходную дарожку, бо размова ідзе ўсяго толькі пра 800 метраў!

— Увогуле ў нас ёсць даручэнне Прэзідэнта звярнуць увагу на прыватны сектар у гарадах, дарогі і асвятленне, — падкрэсліў старшыня Магілёўскага аблвыканкама.

Як і на кожным прыёме, **не абышлося без пытанняў пра паляпшэнне жыллёвых умоў. Наталля ДЗЕМЯНКОВА** паскардзілася, што вымушана жыць нібыта ў цёмнай лужыне, таму што яе прыватны дом цяпер акружылі шматкватэрныя дамы і пазбавілі сонца, сухасці, нармальнага пад'езду. Між тым, паводле генеральнага плана развіцця горада, на месцы дамоў усё роўна павінна прайсці дарога. Але як людзям дажыць у досыць экстрэмальных умовах да часоў перасялення? Пётр Руднік абяцаў, што ўлады будуць шукаць магчымасці.

**Валянціна ЧАЙКІНА** больш за 20 гадоў жыве з дачкой у інтэрнаце, і цяпер, калі можна ўзяць крэдыт і пабудаваць аднапакаёвую кватэру ў кааператыве, выявілася, што гэта справа не па кішэні жанчынам са сціплымі заробкамі, якія да таго ж маюць праблемы са здароўем. Улады паабяцалі яшчэ раз уважліва вывучыць пытанне, але на гэты момант заяўніца не мае падстаў для атрымання сацыяльнага жылля, і таму іншага шляху атрымання ўласнай жылплошчы, акрамя як праз банкаўскі крэдыт, у Валянціны Чайкінай і яе дачкі няма.

Адразу дзве заяўніцы прыйшлі да старшыні Магілёўскага аблвыканкама **па дапамогу ў справе будаўніцтва каналізацыі ў прыватным сектары**. Толькі ў адным выпадку людзі проста прасілі грошы на добрую справу, а ў іншым сабраліся талакой і самі шмат чаго зрабілі, перш чым спытацца пра падтрымку.

**Ганна Іванаўна Прахарэнка і яе суседкі з вуліцы Планетнай**, дзе жывуць адны пенсіянеры, цвёрда вырашылі, што ў іх няма здароўя «хадзіць да ветру з кійкамі» і ў тазіках мыць посуд. Некалькі дзясяткаў дамоў аб'ядналіся ў таварыства, зрабілі праект і геадэзічнае даследаванне. Цяпер для прыходу на вуліцу Планетную «еўрапейскіх выгод», як гавораць самі жанчыны, неабходна сума ў амаль 90 мільёнаў рублёў. Улады, вядома, не будуць плаціць за каналізацыю ў прыватным сектары, але абяцалі падтрымаць ініцыятыўных людзей, якія самі імкнуцца зрабіць сваё жыццё лепшым.

**Ілона ІВАНОВА.**

### Не стой пад кранам?

Машыніст вежавага крана пры выкананні пагрузачна-разгрузачных работ на будоўлі ў 19-м мікраёне Гомеля апускаў паддон з прамысловымі блокамі. Пры гэтым ён зачапіў дах, і груз зваліўся. Блокі трапілі на двух супрацоўнікаў адной з гомельскіх фірмаў, якія стаялі ўнізе, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. 29-гадовы мужчына загінуў, а 47-гадовы атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні. Супраць машыніста вежавага крана Заведзена крымінальная справа.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### «Хуткая дапамога» — умоўная, штрафы — сапраўдныя

Магілёўская ДАІ правяла эксперымент пад назвай «Не застанься абыякавым». Падчас яго высвятлялася, наколькі дысцыплінавана вадзіцелі абласнога цэнтра саступаюць дарогу «хуткай дапамозе» са спецыяльнымі сігналамі? За гадзіну эксперымента інспектары склалі тры адміністрацыйныя пратаколы: парушальнікаў чакаюць грашовыя спагнанні.

### Прадпрымальнік пахне спіртам

Жыхара Бабруйска злавілі з кантрабандным спіртам. На аўтамабілі ён перавозіў 675 літраў спірту: 5-літровыя ёмістасці былі схаваныя пад сядзеннямі ў спецыяльнай нішы.

Аказалася, што гэтага мужчыну, які з'яўляецца прадпрымальнікам, за апошнія некалькі гадоў затрымлівалі з падобным грузам неаднаразова. Таму цяпер міліцыя звярнулася ў падатковую інспекцыю: ці з'яўляецца дзейнасць гэтага прадпрымальніка законнай?

**Алена КАЗЛОВА.**

# Будаўніцтва сваёй атамнай станцыі — безальтэрнатыўны варыянт у павышэнні энергетычнай бяспекі Беларусі

**УВЯДЗЕННЕ атамнай электрастанцыі дапаможа Беларусі значна знізіць тэмпы росту тарыфаў, паколькі сабекошт электраэнергіі на АЭС значна меншы, чым на станцыях спальвання арганічнага паліва, а таксама гэта дазволіць замясціць у паліўным балансе каля 5 млрд кубаметраў прыроднага газу. (Сёння краіна ў год спажывае каля 22 млрд кубоў газу). Пра гэта на адкрыцці III Міжнароднай спецыялізаванай выставы і канферэнцыі «Атамэкспа-Беларусь-2011» паведаміў учора <u>намеснік міністра энергетыкі Рэспублікі Беларусь Міхаіл МІХАДЗЮК</u>.**



Фота БЕЛТА.

Ён нагадаў, што Беларусь пакуль не валодае дастатковай колькасцю ўласных энергарэсурсаў і забяспечвае імі свае патрэбы толькі на 20 працэнтаў. У сённяшніх умовах праблема энергетычнай бяспекі стала актуальнай не толькі перад нашай дзяржавай, а перад усёй сусветнай супольнасцю. Напрыклад, у краінах ЕС нядаўна была прынята дырэктыва аб забеспячэнні энергетычнай бяспекі. Гэта адна з галоўных умоў бяспекі любой краіны, таму кіраўнік нашай дзяржавы і ўрад надаюць гэтаму пытанню вялікае значэнне.

Як патлумачыў намеснік міністра, у краіне ўжо распрацавана разлічаная на наступную пяцігодку дзяржаўная праграма развіцця беларускай энергасістэмы, скіраваная ў першую чаргу на значнае павышэнне эфектыўнасці энергетычнага комплексу. За гэты перыяд плануецца ўвядзенне больш за 3 тысячы мегават новых сучасных эфектыўных энергетычных магутнасцяў і вывад крыху больш за 2 тысячы мегават адпрацаваных магутнасцяў з каэфіцыентам карыснага дзеяння менш за 39 працэнтаў. (Гэта традыцыйная энергетыка, якая стваралася ў краіне ў 60-70 гадах мінулага стагоддзя.) Праграмай таксама прадугледжана развіццё энергетыкі, заснаванай на выкарыстанні мясцовых відаў паліва, аднаўляемых і альтэрнатыўных крыніц энергіі. Але нягледзячы на ўсё гэта, праект развіцця атамнай электрастанцыі з'яўляецца адным з галоўных прыярытэтаў у павышэнні энергетычнай бяспекі краіны. Мы сёння залежым у асноўным ад адной крыніцы паліва — прыроднага газу. Кіраўніком дзяржавы і ўрадам пастаўлена задача знізіць долю спажывання газу ў паліўна-энергетычным балансе, нагадаў Міхаіл Міхадзюк.

Сёння на традыцыйных электрастанцыях паліўны складальнік у сабекошце энергіі дасягае 70 працэнтаў. На атамных станцыях ён не перавышае 20 працэнтаў, таму рост цаны на ядзернае паліва ў значна меншай ступені будзе ўплываць на сабекошт выпрацаванай электраэнергіі, чым рост цэн на газ і вуглевадароды.

— З улікам гэтага рэалізацыя праекта будаўніцтва сваёй атамнай станцыі для нашай краіны — безальтэрнатыўны варыянт у павышэнні энергетычнай бяспекі, — падкрэсліў міністр. —- Акрамя таго, нельга забывацца, што ядзерная энергетыка — новы вíток у развіцці любой краіны, у тым ліку і Рэспублікі Беларусь (навукі, тэхналогій, будаўнічага комплексу і інш.).

Адказваючы на пытанні журналістаў, Міхаіл Міхадзюк патлумачыў, што «...сёння мы працуем над падрыхтоўчым этапам, які б забяспечыў нам плаўны пераход да пачатку будаўніцтва атамнай электрастанцыі». Да пляцоўкі будучай АЭС зараз пракладаюцца аўтамабільная дарога і чыгунка, ствараецца неабходная для забеспячэння будаўніцтва вытворчая база.

— Нашы планы ў бягучым годзе — працягнуць падрыхтоўчыя работы па стварэнні неабходнай вытворчай базы, а пасля падпісання неабходных пагадненняў прыступіць да праектавання.

Што тычыцца атрымання расійскага крэдыту, то міністр паведаміў, што па гэтым пытанні цяпер праводзяцца працоўныя кансультацыі Мінфінаў Расіі і Беларусі пры ўдзеле Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь і «Росатама». Аб'ём крэдыту, а таксама ўмовы яго выдачы абмяркоўваюцца. Беларускі бок унёс свае прапановы па фінансаванні не толькі ўласна станцыі, але і неабходнай вытворчай інфраструктуры.

Узвядзенне атамнай электрастанцыі — гэта не шараговая будоўля, не шараговы праект, падкрэсліў міністр энергетыкі, таму праблем па ўзгадненні праектаў міжурадавых пагадненняў было шмат: яны тычыліся не толькі арганізацыі будаўніцтва, але і падрыхтоўкі кадраў, навуковага забеспячэння, удзелу ў праекце беларускага будаўніча-мантажнага наладачнага комплексу і беларускіх прамысловых прадпрыемстваў са сваёй прадукцыяй і ніш...

— Яны абмеркаваны ў падрыхтаваным міжурадавым пагадненні, якое дазволіць нам асноўныя канцэптуальныя палажэнні, закладзеныя ў гэтае пагадненне, потым перанесці ў кантракт на будаўніцтва станцыі.

На сёння праект міжурадавага пагаднення ўзгоднены і цяпер праходзіць у абедзвюх краінах унутрыдзяржаўныя працэдуры. Намеснік міністра дадаў, што ў азначаным пагадненні зафіксавана, што будаўніцтва АЭС будзе ажыццяўляцца «з максімальным удзелам беларускіх арганізацый».

**Інга МІНДАЛЁВА.**

Дзеля памяці

# «Паляванне» Рубінчыка

### Беларускі кінарэжысёр будзе пахаваны 4 сакавіка



«Шкадую шмат аб чым. Перш за ўсё аб тым, што ў мяне былі вялікія паўзы паміж фільмамі. Тлумачу гэта тым, што надта доўга выбіраў тэму, сцэнарый. Шкадую, што не зняў фільм пра сваё пасляваеннае дзяцінства, пра любімы Мінск. Што мала працаваў у тэатры. Часам шкадую, што не стаў акцёрам... Ва ВГІКу мяне ведалі як здольнага акцёра і таму запрашалі ва ўсе дыпломныя спектаклі акцёрскага факультэта, ва ўсе капуснікі», — прызнаваўся Валерый Рубінчык — рэжысёр, сцэнарыст, чалавек, які вучыў іншых, як здымаць кіно.

Ён меў права вучыць. Таму што сярод яго фільмаў тыя, што сталі класікай беларускага, ды і наогул савецкага кіно, ці расійскага, бо пераехаў у Маскву, калі паклікаў сябра Сяргей Салаўёў. Шмат зняў цудоўных стужак, нездарма заслужыў званне заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі і быў сябрам Акадэміі кінематаграфічных мастацтваў «Ніка».

Яго стужкі сапраўды давалі гледачу асалоду, якую можа даць мастацтва. Яны вобразна-паэтычныя, тонка-пачуццёвыя і адначасова глыбока ўдумлівыя, засяроджаныя на свеце, які хацеў увасобіць сам рэжысёр. Гэта быў свет Беларусі таксама — радзімы Валерыя Давідавіча. Ён нарадзіўся ў Мінску і азы прафесіі пачынаў атрымліваць тут. Ён быў беларускім рэжысёрам, таму што сказаў сваё слова ў важных нацыянальных тэмах, стварыўшы вобраз колішняй Беларусі, з яе легендамі — напрыклад, у стужцы «Магіла льва» паводле Купалы. Але найбольш важны і значны для Беларусі яго фільм «Дзікае паляванне караля Стаха», час стаў своеасаблівым адкрыццём містычнай драмы і прынёс беларускаму кіно шэраг узнагарод на прэстыжных міжнародных кінафестывалях. Ён умеў здымаць кіно. Зняў нават «Кіно пра кіно», якое можна было пабачыць на беларускім кінафестывалі «Лістапад».

Ён быў таленавіты, умеў бачыць прыгожае і паказаць яго праз стужку. Больш за 20 кінапрац — яго творчы багаж. І больш, на жаль, не будзе.

2 сакавіка Валерыя Рубінчыка не стала. Ён пражыў 70 гадоў.

Аднак яго фільмы жывуць і не перастаюць здзіўляць і захапляць — нібыта па-за часам. Нездарма музей гісторыі беларускага кіно да 70-годдзя майстра ладзіў рэтраспектыўную праграму яго фільмаў «Кіно — справа ювелірная». Рубінчык быў сапраўдным ювелірам.

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ СА СМЕРЦЮ КІНАРЭЖЫСЁРА ВАЛЕРЫЯ РУБІНЧЫКА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі Валерыя Рубінчыка яго родным і блізкім.**

«Жыццё нашага земляка Валерыя Рубінчыка было цалкам прысвечана служэнню мастацтву. Мастацкая спадчына майстра — гэта цудоўныя кінафільмы, якія вызначаюцца сваёй разнажанравасцю, захапляючай сюжэтнай лініяй, яркасцю вобразаў і глыбінёй пачуццяў. Яны займаюць дастойнае месца ў сучасным кінематографе.

У Беларусі творчасць Валерыя Давыдавіча паважаюць і любяць. Для нас асабліва дарагія стужкі, створаныя ім на роднай кінастудыі «Беларусьфільм», якія па праву ўваходзяць у залаты фонд нацыянальнай культуры і захапляюць не адно пакаленне гледачоў», — гаворыцца ў спачуванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ЗАГОТОВИТЕЛЬНОГО ЛАРЬКА, 1981 года постройки.**
**Здание расположено по адресу: г. Брест, ул. Катин Бор, на земельном участке площадью 0,0387 га.**
**Общая площадь здания — 68,0 м кв.**
УНП 200224506

Начальная цена — **35 280 000 (тридцать пять миллионов двести восемьдесят тысяч) рублей (без учета НДС).**
Размер задатка — **10 % от начальной цены.**
Прием заявлений заканчивается **14 марта 2011 г. в 17.00.**
**Аукцион состоится 15.03.2011 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Нефтяная, 10.**
Объект продается без условий.
Организатор аукциона — **Брестское районное потребительское общество.**
Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом.
**Контактные телефоны: 8 (029) 722 48 06, 227 58 02, 8 (0162) 23 16 23.**

# Беларусь можа пацярпець ад касмічнай бамбардзіроўкі

**У кастрычніку—снежні гэтага года на тэрыторыю нашай краіны могуць упасці абломкі нямецкага спадарожніка.**

4 краіны — Германія, Польшча, Беларусь і Расія — могуць пацярпець пры падзенні спадарожніка Rosat, які знаходзіцца ў космасе з 1990 года. Вага апарата — 2,5 тоны, ён знаходзіўся на вышыні 580 кіламетраў над планетай. Начынены рэнтгена-тэлескапічнай апаратурай Rosat адкрыў у космасе больш за 125 тысяч крыніц рэнтгенаўскага выпраменьвання, здзейсніў 479 адкрыццяў ва ўльтрафіялетавым дыяпазоне. На аснове атрыманых з гэтага спадарожніка звестак астраномы напісалі больш за 700 навуковых прац і манаграфій.

Тэрмін жыцця апарата быў разлічаны на 18 месяцаў, аднак Rosat спраўна праслужыў цэлых 9 гадоў. У 1999 годзе ўпраўленне спадарожнікам было страчана. Зараз апарат знаходзіцца на вышыні каля 350 кіламетраў і рухаецца па арбіце з хуткасцю да 400 км/г, паступова зніжаючыся. Згодна з разлікамі, пры ўваходжанні спадарожніка ў шчыльныя слаі атмасферы да паўтары тоны металу згарыць. Аднак рэшткі вагой да 1 тоны ўсё ж дасягнуць зямной паверхні — якраз на тэрыторыі Еўропы.

Горшы сцэнарый прадугледжвае, што рэшткі апарата могуць зваліцца на тэрыторыю чатырох краін — Германіі, Польшчы, Беларусі або заходняй часткі Расіі. У лепшым выпадку Rosat цалкам згарыць пры ўваходзе ў атмасферу. Раней на цвёрдую зямлю рэшткі касмічнай тэхнікі падалі толькі адзін раз — у ліпені 1979 года абломкі 69-тоннай амерыканскай арбітальнай станцыі Skylab зваліліся на бязлюдную аўстралійскую пустыню. Зараз у еўрапейскім цэнтры назірання за спадарожнікамі Esoc у нямецкім Дармштадце за Rosat наладжана пастаяннае назіранне.

**Кар. «Звязды».**

# НАМЕРЫ ЗАСТАЮЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зусім іншая справа з тым, што адбылося пасля выбараў, мяркуе беларускі палітык.

— Мы назвалі рэчы сваімі імёнамі: тое, што адбылося пасля выбараў — гэта спланаваная акцыя. Разглядаць другую фазу трэба абсалютна асобна, — падкрэслівае намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — У нас нічога экстравагантнага не адбылося. Да апошняга ўтрымліваліся ад прымянення сілы. А пасля яна была надзвычай стрыманай, у рамках дзейнага нацыянальнага заканадаўства — ніякіх перавышэнняў паўнамоцтваў там не было.

### Якое вітанне — такое адпавяданне

На сустрэчы ў Вене не абышлі ўвагай і ранейшыя дамоўленасці.

— Мы павінны былі праводзіць семінар па СМІ ў нас, — нагадвае Віктар Гумінскі. — Ад гэтай ідэі не адмовіліся, аднак у той абстаноўцы, якая склалася, прапанавалі адкласці яго правядзенне на больш аддаленую перспектыву.

У сітуацыі, калі «10 прадстаўнікоў беларускіх СМІ занесены ў спісы неўязных у краіны ЕС», гаварыць аб свабодзе СМІ, на думку віцэ-спікера, не даводзіцца. Трэба, маўляў, спачатку ўрэгуляваць гэтыя пытанні, а пасля ўжо весці размовы.

Са свайго боку Ута Цапф прапанавала, каб рабочая група ПА АБСЕ па Беларусі, якую яна ўзначальвае, наведала нашу краіну ў канцы сакавіка і азнаёмілася з сітуацыяй у краіне.

— У такім візіце няма неабходнасці, — падкрэслівае намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў і акцэнтуе, што гэта была прынцыповая пазіцыя беларускай дэлегацыі.

Ён нагадвае, што спадарыня Цапф адразу ж пасля прэзідэнцкіх выбараў дала ацэнку сітуацыі, «не ведаючы таго, што аб'ектыўна адбываецца ў Беларусі». А цяпер «прыязджаць і нешта там глядзець, азнаямляцца» ўжо няма чаго: «не вернеш таго, што было сказана».

### Беларускія прапановы

Зімовая сесія ПА АБСЕ, як нагадвае ўдзельніца беларускай дэлегацыі **Ніна МАЗАЙ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы,** рэзалюцый не прымае. Аднак парадак дня да летняй сесіі, дзе і будуць прынятыя рашэнні, фарміруе. Паводле яе слоў, былі абмеркаваны праблемы, звязаныя з рэформай АБСЕ, заклапочанасці эфектыўнасцю работы арганізацыі.

— На парадак дня пастаўлена пытанне аб будучыні АБСЕ, — акцэнтуе сенатар.

Усе прызнаюць неабходнасць такой арганізацыі, але прыходзяць да высновы, што пакуль не навучыліся разам вырашаць наяўныя праблемы.

Нязменнай застаецца беларуская прапанова аб неабходнасці прыняцця статута АБСЕ, дзе, як выказаўся спадар Гумінскі, «усё было б дакладна прапісана, і не засталося ніякіх недамовак». Інстытуты АБСЕ ўтвораныя, цяпер патрэбны прынцыпы і правілы, па якіх яны будуць працаваць іператвораць яе такім чынам у паўнавартасную арганізацыю. Зацікаўлены беларускі бок і ў рэгламентацыі дзейнасці палявых місій АБСЕ, якая дагэтуль адсутнічае. У першую чаргу з-за агучаных у яго адрас прэтэнзій адносна закрыцця офіса арганізацыі ў Мінску.

— Неабходна нейкім чынам афарміць юрыдычна, што сабой уяўляе гэты офіс АБСЕ, яго задачы, калі ён можа быць закрыты, пасля чаго, — мяркуе намеснік старшыні ніжняй палаты беларускага парламента. — Нас у гэтым падтрымала дэлегацыя Расіі: у іх была такая ж сітуацыя з офісам у Абхазіі пасля вядомых падзей.

### Калі супрацоўніцтва, то раўнапраўнае

Аднак, нягледзячы на закрыццё офіса і пэўныя супярэчнасці бакоў, размоў пра тое, каб закрыць наступныя парламенцкія выбары (якія маюць адбыцца ўжо налета) ад міжнародных вачэй, няма.

— Што датычыцца нашых абавязацельстваў перад АБСЕ ды іншымі парламенцкімі арганізацыямі, якія фарміруюць структуры па назіранні за выбарамі, яны застаюцца, — падкрэслівае Ніна Мазай.

Паводле яе слоў, АБСЕ застаецца вельмі важнай, свайго роду ўнікальнай пляцоўкай, дзе адбываецца абмеркаванне актуальных праблем бяспекі, энергетыкі, эканомікі і экалогіі ў Еўропе.

— Мы не кажам пра тое, што будзем згортваць гэта супрацоўніцтва, — запэўнівае Ніна Мазай. — Усе згодныя з тым, што ўзаемадзеянне, гатоўнасць працаваць з Беларуссю і працягваць дыялог — перш за ўсё. Кіраўнік БДІПЧ АБСЕ Янэз Лянарчыч скончыў сваё выступленне словамі: «Мы глядзім на шлях наперад — актыўны, ініцыятыўны ўдзел Беларусі ў АБСЕ і супрацоўніцтва застаюцца на парадку дня». З гэтага і трэба зыходзіць.

У Беларусі адна ўмова — супрацоўніцтва павінна быць раўнапраўным.

— Відаць, некаму не падабаецца, што сёння Беларусь з'яўляецца суверэннай дзяржавай, уносіць свае прапановы па светаўладкаванні, — лічыць В. Гумінскі. — Але мы заўжды ў сваіх выступленнях казалі пра тое, што трэба зыходзіць з назвы: Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Беларусь не з'яўляецца «астраўком нестабільнасці», якая выклікала б пагрозу бяспецы нашых суседзяў ці іншых краін ЕС.

Аналагічнае стаўленне і да ўдзелу ў Еўранэсце (парламенцкім вымярэнні Усходняга партнёрства), работу якога плануецца пачаць без Беларусі. Тым часам самі парламентарыі, паводле яго слоў, «не сядзяць склаўшы рукі». Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў скіравала звароты аналагічным парламенцкім камісіям іншых удзельніц Усходняга партнёрства, каб яны падтрымалі пазіцыю Беларусі. Прадстаўнікі Арменіі, Азербайджана і Украіны, паводле інфармацыі віцэ-спікера, ужо выказалі сваю падтрымку. А да раўнапраўнага партнёрства, без ціску і ў рамках міжнародных дамоў на гэтым баку заўжды гатовыя.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

**Минский районный исполнительный комитет** *7 апреля 2011 г.* **проводит открытый** *аукцион*
**по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Тейки | г. Заславль, ул. Анусинская, 86 | г. Заславль, ул. С.Будного, 20 | г. Заславль, ул. Новая, 51 |
| 2 | Кадастровый номер | 623681317601000029 | 623650100001004295 | 623650100001004298 | 623650100001004294 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1486 га | 0,0993 га | 0,0926 га | 0,1500 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 305 030 | 1 035 190 | 1 003 490 | 851 090 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 7 000 000 | 51 000 000 | 59 000 000 | 69 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 700 000 | 5 100 000 | 5 900 000 | 6 900 000 |

| | | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | г. Заславль, ул. Комсомольская | Мачулищанский п/с, д. Мачулищи | Мачулищанский п/с, д. Александрово, ул. Лесная | Папернянский с/с, д. Цнянка |
| 2 | Кадастровый номер | 623650100001004106 | 623675202001000267 | 623675200501000074 | 623685512101000536 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1495 га | 0,0927 га | 0,1780 га | 0,1500 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 562 310 | 1 174 190 | 1 212 770 | 1 243 820 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 48 000 000 | 22 000 000 | 64 000 000 | 17 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 4 800 000 | 2 200 000 | 6 400 000 | 1 700 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 07.04.2011 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 01.04.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 2–5 – на расчетный счет № 3600621200010 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На Лоты 6–7 – на расчетный счет № 3600621080100 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600452694, код платежа – 04901.

На Лот 8 – на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

<u>Документы, необходимые для участия в аукционе:</u>

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

3 сакавіка 2011 г.
№ 8 (246)


ПЯРВІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ

## Магчымасці і патрэбы

*Пасля таго, як у студзені 2007 г. быў падпісаны Указ Прэзідэнта № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання...», нізавое звяно ўлады, нарэшце, ператварылася ў «аб'ект» пільнай увагі дзяржаўных уладных структур. Адміністрацыйныя будынкі сельскіх і пасялковых Саветаў адрамантавалі і абсталявалі камп'ютарамі, кіраўнікам мясцовай улады пашырылі паўнамоцтвы, забяспечылі іх аўтамабілямі і мабільнай сувяззю. Шэраг камунальных аб'ектаў, якія раней не мелі свайго балансаўтрымальніка і фактычна «віселі» на сельвыканкамах, перадалі спецыялізаваным структурам... Усё гэта рабілася з адной мэтай: стварыўшы адпаведныя ўмовы нізавой уладзе, павысіць яе магчымасці ў вырашэнні мясцовых праблем...*

*Зразумела, усе пытанні і праблемы «нізоў» нельга прадугледзець і вырашыць адным указам. Дапаўненні і карэктывы ўносіла само жыццё. Пачалі, скажам, перадаваць на баланс спецарганізацый дарогі і сістэмы водазабеспячэння — высветлілася, што «безгаспадарнымі» з'яўляюцца і могілкі, і грамадзянскія калодзежы... Вызначылі пералік даходных крыніц сельсавецкага бюджэту — аказалася, што іх недастаткова для вырашэння мясцовых задач. І з гэтага года ў пярвічных бюджэтах пачне заставацца частка падаходных падаткаў з фізічных асоб...*

*Пакрысе мы ўсё ж рухаемся наперад. Магчыма, не так хутка, як хацелася б: вось і з перадачай сельскіх дарог «затармазілі» на некалькі гадоў — пакуль вырашалі пытанне аб тым, хто ўсё ж павінен рыхтаваць адпаведную дакументацыю: былыя гаспадары ці новыя... Зноў жа, сама па сабе перадача камунальных аб'ектаў спецарганізацыям — не самамэта. Асноўнае тут — вызваліць мясцовую ўладу (пярвічны ўзровень) ад неўласцівых функцый, развязаць ёй рукі, павярнуць тварам да людзей, якія жывуць побач, да сваёй тэрыторыі.*

*Словам, мясцовай уладзе дадзены шанц. І магчымасці. І пэўныя матэрыяльныя рэсурсы, хоць іх, безумоўна, не хапае. Можна на гэта скардзіцца. Можна ўвесь час жыць у чаканні датацый. А можна шукаць шляхі для папаўнення бюджэту, развіваць вытворчасць, падтрымліваць ініцыятыву, не баяцца рызыкаваць, браць на сябе адказнасць. Цяпер слова за кіраўнікамі пярвічнага ўзроўню ўлады, старшынямі сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў... Калі ёсць што сказаць — выказвайцеся. Ну а «МС», як заўсёды, будзе з задавальненнем прадастаўляць вам газетную плошчу.*

**Анатоль ПРЫГАРА, старшыня Матыкальскага сельскага Савета дэпутатаў Брэсцкага раёна:**

— Сёлета ў нас клопатаў дабавілася — з-за пад'ёму грунтовых водаў пачалося падтапленне падворкаў. Прычым там, дзе раней такіх праблем ніколі не ўзнікала: людзі дзесяцігоддзямі жылі і лічылі гэтыя мясціны сухімі... Паводкі як такой у нас не чакаецца, таму што снегавое покрыва невялікае. Але вада паднімаецца знізу, затапляе падвалы... Капаем абвадныя каналы для скідвання вады. Адзін ужо зроблены, цяпер бяромся за другі — вакол вёскі Каваргдзякі, якая пацярпела больш за іншыя. Хутка гэта не робіцца — шмат часу займае падрыхтоўка адпаведнай праектнай дакументацыі: там жа і кабель пракладзены, і газаправод. Ды і грошы патрэбны немалыя. Дапамагае Брэсцкі райвыканкам, упраўленне капітальнага будаўніцтва выступіла заказчыкам праекта. Дзесьці да мая плануем закончыць будаўніцтва канала.

Праблем у мясцовай улады заўсёды хапае — сёння адно, заўтра іншае... Але невырашальных, напэўна, не існуе. Рана ці позна ўсё можна зрушыць з месца. Напрыклад, вывазам смецця і навядзеннем парадку ў нас на тэрыторыі цяпер займаецца ЖКГ — перадалі ўсё ім. Але ж гэта не азначае, што аддалі — і забылі. Над пытаннем працуюць і яны, і мы, і санстанцыя. У нас ёсць і кантэйнерны вываз, і вываз з дапамогай тэхнікі па пэўных днях і гадзінах. Людзі смецце выносяць на двор — тэхніка яго забірае... Дарэчы, дагаворы з ЖКГ на вываз смецця заключылі амаль 100 працэнтаў домаўладанняў. Зрабіць гэта было не вельмі проста, але мы працавалі. І санстанцыя наша варушылася. Прынамсі, несанкцыянаваных звалак на тэрыторыі я не бачу... Праблемы са смеццем ствараюць хіба што дачнікі-гараджане — не толькі ў нас, але, напэўна, паўсюль, дзе ёсць дачныя кааператывы. Вакол нашых Матыкал знаходзіцца 15 дачных пасёлкаў. Самі разумееце, што адсюль вынікае. Ставім ім кантэйнеры, паралельна старшыні садаводчых таварыстваў заключаюць дагаворы з ЖКГ на вываз смецця, пералічваюць за гэта грошы... Словам, спрабуем на дачнікаў уплываць, хоць, шчыра кажучы, бывае складана. Але іх тлумачэнні накшталт «мы вывозім сваё смецце ў горад» ужо не праходзяць...

З 2009 года нашы дарогі пачала абслугоўваць спецыялізаваная дарожная арганізацыя. Не магу сказаць, што мы вельмі задаволеныя гэтым абслугоўваннем — іх тэхнічная база якой была, такой і засталася. Але хоць адказнасць з'явілася. Прынамсі, нам ёсць на каго «пераводзіць стрэлкі», ёсць з каго запатрабаваць.

Асноўная наша праблема — фінансы, дакладней, іх пастаянны недахоп. Магчымасці сельвыканкама ўвесь час адстаюць ад патрэбаў тэрыторыі, нягледзячы на тое, што летась сельвыканкам зарабіў на продажы зямельных участкаў (з аўкцыёну) каля 180 мільёнаў рублёў. Яны засталіся ў нашым бюджэце і былі патрачаны на добраўпарадкаванне: пераважна на падтрымку нармальнага стану дарог.

Дарэчы, у нашых суседзяў-палякаў, з якімі мы кантактуем, падыходы да фарміравання мясцовых бюджэтаў зусім іншыя. А менавіта: усе падаткі, якія збіраюцца на тэрыторыі гміны (аналага нашага сельсавета), застаюцца ў яе распараджэнні. І мясцовая ўлада сама вырашае, куды іх накіроўваць. На больш высокі ўзровень ніякіх падаткаў не пералічваецца. Праўда, мясцовая ўлада сама, за сродкі тэрыторыі, абслугоўвае і дарогі, і ўстановы аховы здароўя, і школы, плаціць заработную плату і настаўнікам, і ўрачам... У штат мясцовай адміністрацыі там уваходзіць 28 чалавек, зарплата ў бурмістра (кіраўніка) — 2 тысячы еўра... У штаце нашага сельвыканкама (пры аналагічнай колькасці насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі сельсавета) працуе 7 чалавек. Зарплата старшыні Савета эквівалентная 500 доларам...

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

## Прапановы будуць улічаны. Але аб'ект давядзецца закрыць



**Жыхары Багушэўскага сельсавета Сенненскага раёна, незадаволеныя закрыццём мясцовага пункта прыёму малака (ён належыць ААТ «Аршанскі малочны камбінат»), звярнуліся са скаргай у рэдакцыю. («МС» падрабязна напісала пра гэта ў нумары за 17 лютага гг.). Нагадаем: людзі патрабавалі пакінуць у Багушэўску прыёмны малакапункт, праца якога, па іх словах, цалкам усіх задавальняла. Яны настойвалі на тым, што хочуць здаваць малако дзяржаве без усялякіх пасрэднікаў** ***(малаказборшчыкаў ад камбіната ці індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца зборам насельніцкага малака ў суседніх сельсаветах. — Рэд.).*** **Маўляў, дзейнасць гэтых самых пасрэднікаў не з'яўляецца «празрыстай». А таму лепш за прыёмны пункт, куды можна ўласнаручна аднесці лішкі малака, нічога быць не можа.**

Днямі рэдакцыя атрымала адказ камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама. У ім паведамляецца, што неабходнасць у закрыцці Багушэўскага малакапрыёмнага пункту ўзнікла, па-першае, у сувязі з узрастаннем патрабаванняў да санітарна-тэхнічнага стану перапрацоўчых прадпрыемстваў, а па-другое, па прычыне скарачэння аб'ёмаў закупкі малака ў насельніцтва.

Каб рэалізоўваць на экспарт масла, сухое малако, сыры і казаін, гаворыцца ў адказе, Аршанскаму малочнаму камбінату і яго вытворчым цэхам неабходна атрымаць экспартны ветэрынарны нумар. Для гэтага яны павінны мець сертыфікаваную сістэму кіравання якасцю і бяспечнасцю прадукцыі на падставе аналізу рызыкі і кантрольных крытычных кропак (НАССР). Такая сістэма патрабуе адпаведнасці ўсяго працэсу вытворчасці (пачынаючы з нарыхтоўкі сыравіны) патрабаванням СанПіН 2.3.4.13—19—2002 «Вытворчасць малака і малочных прадуктаў» і «Ветэрынарна-санітарных правілаў для арганізацый, якія здзяйсняюць прыёмку малака, вытворчасць, захаванне і рэалізацыю малочных прадуктаў», зацверджаных пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ад 21.12.2009 г. № 82.

**Багушэўскі малакапрыёмны пункт сёння не адпавядае патрабаванням вышэйназваных санітарных і ветэрынарных правілаў.** Да таго ж, (па стане на 7.02.2011 г.) на пункт паступіла ўсяго 0,8 тоны малака.

Сёлета па Багушэўскім сельсавеце было заключана 27 дагавораў на здачу малака. З усіх здатчыкаў толькі трое пражываюць у Багушэўску, астатнія — у суседніх вёсках Скоґ, Янава, Рыбнае, Каленькі, Заветнае, Засценькі і Рабцава. У 2010 годзе пагалоўе кароў на тэрыторыі Багушэўскага сельсавета скарацілася на 24. У насельніцтва закуплена 232 тоны малака, што складае 79 працэнтаў да ўзроўню 2009 года.

Утрыманне малакапрыёмнага пункта пры такіх невялікіх аб'ёмах, а тым больш укладанне фінансавых рэсурсаў у яго тэхнічнае пераабсталяванне эканамічна немэтазгоднае і прынясе дадатковыя страты ААТ «Аршанскі малочны камбінат».

Вышэйназваны камбінат арганізаваў збор малака ад насельніцтва Багушэўскага сельсавета па вопыце іншых раёнаў — праз малаказборшчыкаў Сенненскага вытворчага цэха, з індывідуальным пад'ездам да кожнага падворка. Пры гэтым аб'ёмы здадзенага малака і яго тлустасць адлюстроўваюцца ў ведамасці і асабістых кніжках малаказдатчыкаў.

Разлікі за закупленае малако робяцца па закупачнай цане першага гатунку за 1 кілаграм базіснай тлустасці (з 24.12.2010 г. — 965 рублёў плюс 85 рублёў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту) праз паштовае аддзяленне. Уся інфармацыя па разліках назапашваецца ў бухгалтэрыі прадпрыемства, дзе кожны малаказдатчык можа атрымаць яе па першым запатрабаванні.

Малако ад фермерскіх гаспадарак прымаецца і дастаўляецца на перапрацоўку асобнай партыяй і ацэньваецца па гатунках. Для ацэнкі якасці такога малака падчас адпраўкі і запаўнення накладной Аршанскі малочны камбінат абавязаны перадаць фермерам у бязвыплатнае карыстанне прыбор для экспрэс-аналізу.

ААТ «Аршанскі малочны камбінат» паабяцаў улічыць і іншыя прапановы малаказдатчыкаў Багушэўскага сельсавета па ўдасканаленні парадку збору і аплаты лішкаў малака ў межах дзейнага заканадаўства, гаворыцца ў адказе.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

## АДНОЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ МАЛА



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### Тры «кіты» мясцовага самакіравання

**Камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КТГСы) існуюць у Мінску не адзін год і даўно даказалі сваю карыснасць і эфектыўнасць. Аднак па выніках мінулага года ў Мінску налічвалася ўсяго 37 вышэйназваных камітэтаў, хоць мікрараёнаў у сталіцы 115. Чаму ж такая станоўчая практыка не атрымала больш шырокага ўкаранення? За адказам мы звярнуліся да старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Міхаіла САВАНОВІЧА.**

— Цяжка пераацаніць карыснасць КТГСаў, — адзначыў старшыня гарсавета. — Гэты інстытут з'яўляецца, з аднаго боку, механізмам прыцягнення гараджан у працэсы паляпшэння асяродку жыццядзейнасці канкрэтных мікрараёнаў і інфармавання насельніцтва. А з другога боку — гэта структура грамадскага кантролю за працэсамі, якія адбываюцца на канкрэтнай тэрыторыі.

Найбольш эфектыўна камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання дзейнічаюць у Фрунзенскім раёне — там іх больш, чым у іншых раёнах сталіцы. Нейкай выражанай спецыфікі Фрунзенскі раён не мае. Сакрэтам эфектыўнай дзейнасці работы КТГСаў Міхаіл Савановіч называе славуты чалавечы фактар. Мясцовым жыхарам пашанцавала з кіраўніцтвам раённай адміністрацыі, якая заўсёды актыўна падтрымлівала стварэнне КТГСаў, падбірала для іх кадры, дапамагала вырашаць канкрэтныя пытанні. А калі ёсць дапамога і падтрымка — КТГСы апраўдваюць сябе...

— Самае галоўнае, што неабходна зрабіць любой раённай адміністрацыі для арганізацыі КТГСаў на сваёй тэрыторыі, — добра папрацаваць і знайсці неабыякавых, ініцыятыўных людзей. Варта ўцягнуць у гэтую работу і ЖЭСы, якія бліжэй кантактуюць са сваім насельніцтвам і добра ведаюць самых актыўных жыхароў пад'езда ці дома, якія ім, ЖЭСаўскім работнікам, не даюць спакойна жыць. Такіх людзей трэба прыцягваць у КТГСы, дзе яны змогуць адстойваць інтарэсы жыльцоў тэрыторыі і кантраляваць работу эксплуатацыйных службаў.

КТГСы дапамагаюць вырашаць самыя розныя пытанні (добраўпарадкавання, прыёмкі дамоў пасля капрамонту і інш.), але найбольш важнай на сёння задачай для сталічных камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання старшыня Мінгарсавета лічыць наступную:

— Самае балючае наша пытанне — гэта ўшчыльненне раёнаў старой гарадской забудовы. Практычна да кожнага дэпутата Мінскага гарсавета прыходзілі выбаршчыкі з такой праблемай. Колькі разоў было, што ўсе зацікаўленыя службы прызналі будаўніцтва на канкрэтным участку дзейным нарматывам, а мясцовыя жыхары актыўна праціўіліся. З аднаго боку, грамадзян зразумець можна: няма нічога прыемнага, калі ў тваім двары «вокны ў вокны» ўзводзіцца новы дом, але трэба браць у разлік і інтарэсы тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і таксама хоча мець сваю кватэру. У асвоеным раёне, дзе ўжо створана ўся сацыяльная і інжынерная інфраструктура, кошт будаўнічых работ меншы, чым у новым, дзе ўсё даводзіцца ствараць з нуля.

Здымаць напружанасць у гэтым няпростым пытанні маглі б у тым ліку і КТГСы. У ідэале, на стадыі першай прапрацоўкі праекта будаўніцтва — яшчэ да выдзялення зямельнага ўчастка — архітэктар і адміністрацыя павінны сустрэцца з актывам канкрэтнай тэрыторыі, з КТГСам, патлумачыць неабходнасць узвядзення аб'екта, пацвердзіць адпаведнасць нормам, паказаць чарцяжы. А потым члены КТГСа разам з актывістамі (старэйшымі пад'ездаў, упаўнаважанымі дамоў) данясуць інфармацыю да жыльцоў. Пры гэтым давер да сваіх суседзяў заўсёды значна большы, чым да «чужых» — прадстаўнікоў адміністрацыі, архітэктурнай службы і г.д.

Сёння практычна ніводзін новы гарадскі аб'ект не ўзводзіцца ў раёне старой забудовы без умяшання жыхароў. І ў большасці выпадкаў людзі проста прадузята ставяцца да ўшчыльнення. У выніку абвастраецца напружанасць там, дзе дзякуючы КТГСам сітуацыю можна было б знівеліраваць.

> **З 37 дзейсных камітэтаў горада на грашовую падтрымку могуць разлічваць толькі 6 пераможцаў. А як працаваць астатнім?**

— У нас ёсць выпадкі, калі дзякуючы КТГСам спробы «кропкавай» забудовы раёна былі спыненыя, — патлумачыў **намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Георгій КОЗЕЛ**. — Сітуацыя магла мець значна больш рэзананс, але актыў КТГСа запэўніў жыльцоў, што ўрэгулюе пытанне ўшчыльнення разам з адміністрацыяй і кіраўніцтвам горада. У выніку было прынята рашэнне аб адмене будаўніцтва. Цяпер, у адпаведнасці з заканадаўствам, будаўніцтва шэрагу аб'ектаў патрабуе грамадскага абмеркавання. А як яго арганізаваць? Больш эфектыўна і прадуктыўна — з дапамогай КТГСаў.

У нашым раёне дом пасля капітальнага рамонту не можа быць прыняты без подпісу членаў КТГСа, якія таксама бяруць удзел у камісіі па прыёмцы (зразумела, там, дзе КТГСы ёсць). КТГС — механізм данясення інфармацыі да мясцовай улады па пытаннях, якія не вырашае ЖЭС. КТГСы больш цесна працуюць з адміністрацыямі раёнаў, а не з ЖЭСамі, чыю работу кантралююць... Мы, як улада, самі ведаем праблемы нашых раёнаў. У новых — гэта адставанне тэмпаў будаўніцтва сацыяльнай інфраструктуры ад тэмпаў здачы жылля. Не хапае садкоў, школ, магазінаў, натарыяльных кантор і іншых аб'ектаў, без якіх немагчыма стварыць асяродак, камфортны для пражывання. КТГСы ўсё гэта агучваюць.

Як патлумачыў Георгій Уладзіміравіч, кожны месяц кіраўнікі КТГСаў бяруць удзел у пашыраных планёрках раённай адміністрацыі, дзе прысутнічаюць дэпутаты гарсавета, кіраўнікі ўсіх службаў. Там прадстаўнік КТГСа можа паведаміць аб праблемах сваёй тэрыторыі. Напрыклад, пра разукамплектаванне аўтамабіляў жыльцоў, прыпаркаваных у двары (зладзеі здымаюць калёсы, крадуць магнітолы і г.д.). Сёння гэта сапраўдны «біч» сталічных двароў.

Актыў КТГСа ажыццяўляе своеасаблівы грамадскі кантроль, прафілактыку п'янства і правапарушэнняў, маніторынг сацыяльнай небяспекі ў сваім двары, доме, пад'ездзе. У першую чаргу гэта характэрна для старых тэрыторый раёна. Сталыя людзі ведаюць і сваіх, і чужых, яны заўважаць, што каля гандлёвай кропкі збіраюцца нейкія асацыяльныя элементы, і паведамяць участковаму ці ў адміністрацыю.

Акрамя таго, добрае ўзаемадзеянне атрымалася ў КТГСаў з сацыяльнай службай. Грамадскія актывісты — а гэта, як правіла, людзі сталага ўзросту, ветэраны, пенсіянеры — добра ведаюць катэгорыю адзінокіх састарэлых, адзінока пражываючых. Яна заўсёды заўважаць, што, напрыклад, сёння пажылая суседка не выйшла ў магазін. Абавязкова праверацъ, што з ёй. Актыў камітэта перадасць інфармацыю ў сацыяльную службу, якая прапануе хвораму чалавеку надомнае абслугоўванне.

А аднойчы, напрыклад, чорныя рыэлтары захацелі «ўвесці» ў адзінокага пенсіянера кватэру. Грамадскія актывісты забілі ў набат. Калі ў адміністрацыі пра гэта даведаліся, то паспелі спыніць аферу.

— Яскравы прыклад актыўнай работы КТГСа ў Масюкоўшчыне, дзе былы ваенны гарадок быў перададзены ў жылы фонд горада. Будынкі там старыя, патрабуюць рамонту. Кіраўнік мясцовага КТГСа Фёдар Фёдаравіч Сакаленка (палкоўнік, служыў у Афганістане, мае баявыя ўзнагароды) знайшоў паразуменне з мясцовым ЖЭСам №57. Я не скажу, што там ужо атрымалася «зняць» усе праблемы, якія існуюць. Гэта не так (сацыяльная інфраструктура пакуль яшчэ недастаткова развітая), але паступова сітуацыя выпраўляецца. У тым ліку і дзякуючы намаганням КТГСа.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## «ШЛЯХ ДА ПАПРАЎКІ МОЖНА СКАРАЦІЦЬ»



**Улада павінна быць бліжэй да людзей. Для Анатоля ПАЎЛОВІЧА гэта не зацёрты слоган, а стыль работы. Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве сустракаецца са сваімі выбаршчыкамі тры разы на месяц. Месца сустрэчы... змяняць трэба. Яно павінна быць бліжэй да дому выбаршчыка, перакананы дэпутат. Такой мабільнасці вымагае сама акруга, якая знаходзіцца ў «цікавым» становішчы — на мяжы двух сталічных раёнаў, у трох кутках: у зоне ўнівермага «Беларусь», Чыжоўкі ды Серабранкі.**

— Прыём праводжу ў мясцовых школах, каб жыхару Чыжоўкі не даводзілася ехаць у Серабранку, і наадварот, — расказвае парламентарый. — Выйсці на мяне са сваёй праблемай выбаршчыкам заўжды лёгка і зручна.

А вось якія гэта праблемы — справа асобная.

— Вельмі часта звяртаюцца з такімі побытавымі пытаннямі, вырашаць якія і не павінен парламентарый: цеча ў даху, канфлікты з суседзямі, дзяльба зямельных участкаў, — прыгадвае Анатоль Паўловіч. — У прынцыпе, гэта кампетэнцыя дэпутата гарсавета. Але ж, калі звяртаюцца з гэтым да нас, мы не можам адмовіць. І з капрамонтам, і з цеплавой рэабілітацыяй жылля дапамагаем.

Графікі капітальных рамонтаў і цеплавых рэабілітацый да 2015 года ў раёне ўжо складзеныя. І людзі, якія ў гэтых графіках сябе не знайшлі, натуральна, звяртаюцца да дэпутата.

— Фінансавых магчымасцяў у сталіцы недастаткова для таго, каб вырашыць усе гэтыя пытанні, — такі вялікі жыллёвы фонд. Таму прыярытэтнымі становяцца самыя старыя, зношаныя будынкі, — тлумачыць сітуацыю народны выбраннік. — Але калі ёсць групавыя звароты жыхароў іншых дамоў, тады мы разам з адміністрацыямі Заводскага і Ленінскага раёнаў разглядаем, ці можна нечым дапамагчы людзям. І за мінулы год для многіх дамоў (у прыватнасці, па вуліцах Васняцова, Народная, Гараўца) нам удалося знайсці дадатковыя рэсурсы.

Народны выбраннік клапоціцца і пра іншыя атрыбуты камфорту для сваіх выбаршчыкаў.

— У наш век інфарматызацыі нельга быць абмежаваным у атрыманні інфармацыі, — перакананы дэпутат, які пасадзейнічаў з'яўленню ў сваёй акрузе кабельнага тэлебачання.

20 новых каналаў прыйшліся даспадобы больш як 13 тысячам выбаршчыкаў, асабліва пажылым людзям, якія шмат часу праводзяць перад тэлевізарам. Але ж галоўнае сваё прызначэнне парламентарый бачыць у іншым:

— Дапамагаючы людзям у акрузе, дэпутату неабходна назбіраць праблемных пытанняў, якія могуць быць вырашаны заканадаўча.

Такі шлях да заканадаўчай папраўкі, а значыць і да папраўкі становішча ў цэлым, відавочна карацейшы.

> **Калі будуецца ў два разы больш «квадратных метраў», то неабходна, каб гэта адбівалася і на прасоўванні жыллёвай чаргі. Грошы сюды ўкладваюцца велізарныя, будоўля ідзе маштабная, адпаведным павінен быць і эфект.**

— Заўжды шукаем магчымасці матэрыяльна дапамагчы тутэйшым школам, інтэрнатам, грамадскім аб'яднанням. І кожнаму паасобку, хто мае патрэбу ў падтрымцы. Вось, напрыклад, кватэра ветэрана знаходзілася ў занядбаным стане. Дзеці ў жанчыны ёсць, па заканадаўстве сацыяльная служба не ў праве дапамагаць такім састарэлым. Але што зробіш, калі дзеці і самі жывуць небагата, на рамонт кватэры маці грошай няма?.. Мы знайшлі магчымасць аказаць ёй спонсарскую дапамогу ў памеры 1,5 млн рублёў. На вылучаныя грошы мясцовае ЖРЭА выканала рамонт. Ведалі б вы, колькі слоў падзякі мы пачулі! Аднак, аказваючы матэрыяльную дапамогу, заўжды сутыкаемся са шматлікімі цяжкасцямі. А ўсё з-за таго, што ў нас дагэтуль няма закона аб спонсарскай дапамозе. Возьмем тыя ж прадпрыемствы, якія шэфствуюць над школамі. Яны і рады б дапамагчы, але ж на іх шляху ўзнікае столькі абмежаванняў і бюракратычных перашкод, што нават цяжка ўявіць. Складаная сістэма ўзгадненняў не дае прадпрыемствам належным чынам праявіць ініцыятыву.

Дэпутат мяркуе, што ў будучым законе аб спонсарскай дапамозе трэба даць ім больш свабоды:

— Неабходна заканадаўча павысіць самастойнасць кіраўніка прадпрыемства, які мае намер аказаць спонсарскую дапамогу. Пакінуць яму на водкуп гэта пытанне. Навошта гэтыя шматузроўневыя ўзгадненні?!

Не дае спакою дэпутату і сістэма прфесійна-тэхнічнай адукацыі. Ён ведае, чаго ёй нестае і як дапамагчы:

— Мы сёння вядзём размовы пра мадэрнізацыю эканомікі. Сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якую мы, на шчасце, захавалі, забяспечвае гэты кірунак кадрамі. Але тэхналагічная база, на якой рыхтуюць навучэнцаў, састарэла. Што заводы адпраўляюць на звалку, дастаецца ПТВ. Трэба прапісаць у заканадаўстве, што ПТВ не павінны фінансавацца па рэшткавым прынцыпе! Абсталяванне ім патрэбна нармальнае. Калі нядаўна ў парламенце разглядалі праграму дзейнасці ўрада на наступную пяцігодку, я віцэ-прэм'еру Анатолю Тозіку гэта пытанне задаваў. Ён паабяцаў, што будзем разам шукаць рашэнне.

У праграме дзейнасці ўрада ёсць і яшчэ адзін момант, на які звярнуў увагу парламентарый. Ён датычыцца ўдасканалення заканадаўства ў галіне прадпрымальніцтва.

— Задачы па развіцці прадпрымальніцтва да 2015 года пастаўлены вельмі сур'ёзныя. Калі ў 2005 годзе аб'ём прадукцыі прадпрымальніцтва ў аб'ёме валавага ўнутранага прадукту складаў прыблізна 8 працэнтаў, то сёння гэты паказчык ужо ўдвая большы. А да 2015 года яго трэба давесці ажно да 30 працэнтаў! Чаму так важна разнявольваць бізнэс? Бо гэта — занятасць нашых людзей. Мы зараз павышаем эфектыўнасць многіх буйных прадпрыемстваў, уводзім новае абсталяванне — адпаведна, колькасць працаўнікоў будзе скарачацца. Куды яны ўсе пойдуць? У малы і сярэдні бізнэс. І тут трэба спяшацца — хутчэй ствараць як мага больш працоўных месцаў. Да 2015 года колькасць занятых у малым і сярэднім бізнэсе павінна павялічыцца да 1,8 млн чалавек.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

## МАКСІМАЛЬНА ЗАРАБЛЯЮЦЬ НА ПАДАТКАХ

**Пры разглядзе пытання аб выніках выканання бюджэту за 2010 год на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама падкрэслівалася, што мясцовыя Саветы дэпутатаў максімальна выкарысталі права па ўстанаўленні мясцовых падаткаў і збораў, за кошт чаго ў бюджэт былі прыцягнуты 56 мільярдаў рублёў.**

Як адзначыў **начальнік фінансавага ўпраўлення Віцебскага аблвыканкама Барыс КІЧАНОЎСКІ**, за кошт павышэння ставак падаткаў на ўласнасць атрыманы 44 мільярды рублёў. Павялічаны паступленні ад выкарыстання маёмасці камунальнай уласнасці. Па выніках правядзення аўкцыёнаў у бюджэт паступіла 4,8 мільярда рублёў. Ад прадпрыемстваў, створаных у малых населеных пунктах, у мясцовую «кішэню» трапіла 9,9 мільярда рублёў.

Пры фарміраванні бюджэту на 2011 год выкарыстаны такі важнейшы інструмент для павелічэння даходаў, як зацікаўленасць мясцовых органаў кіравання і самакіравання ў павышэнні эфектыўнасці працы падведамасных арганізацый. У гэтым годзе ўся сума падаткаў на прыбытак ад такіх плацельшчыкаў залічваецца ў мясцовы бюджэт. Мяркуецца, што гэта будзе стымулам для прыняцця эфектыўных мер па зніжэнні затрат на вытворчасць і павелічэння яе рэнтабельнасці.

Сёлета ад арганізацый і прадпрыемстваў, створаных у малых населеных пунктах, у бюджэт Віцебскай вобласці плануецца атрымаць падаткаў і збораў на суму не менш чым 12 мільярдаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# АДНОЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ МАЛА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Удзел у рабоце камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — клопатная справа, якая забірае шмат часу, таму не дзіва, што часцей членамі КТГСа становяцца пенсіянеры. Самыя гарачыя перыяды для іх — восень, зіма і вясна. Летам людзі раз'язджаюцца на дачы ці проста на адпачынак.

Неабходнасць у КТГСах не змяншаецца, пераканаы Міхаіл Савановіч. Яны патрэбны сёння і застануцца патрэбнымі ў перспектыве. Асабліва ў Мінску. У кожнага дэпутата гарсавета на тэрыторыі выбарчай акругі пражывае каля 20 тысяч выбаршчыкаў. Аднаму дэпутату дайсці да кожнага выбаршчыка нерэальна. Вельмі дзейсная работа дэпутата з насельніцтвам — менавіта праз узаемадзеянне з КТГСамі.

А Георгій Козел звярнуў увагу на тое, што неабыякавасць, актыўнасць, удзел у сацыяльных працэсах больш тыповыя для старых мікрараёнаў, дзе людзі даўно жывуць побач, добра ведаюць адно аднаго. А ў мікрараёнах новабудоўляў складана арганізаваць КТГС, цяжка знайсці старэйшых па пад'ездзе, па доме.

Хочам мы таго ці не, але ў грамадстве больш яўна пачаў праяўляцца меркантылізм. Гэта азначае, што ў сённяшніх умовах любая праца павінна неяк матэрыяльна заахвочвацца. З 2002 года ў сталіцы праходзіць штогадовы конкурс-агляд дзейнасці камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Грашовымі прэміямі ўзнагароджваюцца 6 КГТСаў-пераможцаў (умовамі конкурсу прадугледжана адно першае месца — 5 млн рублёў, два другіх — па 3 млн і тры трэція — па 2 млн). Сродкі выдзяляюцца з рэзервовага фонду Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і расходуюцца пераможцамі на заахвочванне актыву, на правядзенне планавых мерапрыемстваў, на набыццё саджанцаў і кветак для азелянення, устаноўку абсталявання для дзіцячых пляцовак і інш. Атрымліваецца, што з 37 дзейсных камітэтаў горада на грашовую падтрымку могуць разлічваць толькі 6 пераможцаў. А як працаваць астатнім?

Расходы, што фінансуюцца за кошт бюджэту горада Мінска, вызначаны артыкулам №47 Бюджэтнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, але выдаткаванне сродкаў на ўтрыманне і функцыянаванне грамадскіх аб'яднанняў (якімі з'яўляюцца і КТГСы) там не прадугледжана. У адпаведнасці з заканадаўствам, сродкі рэспубліканскага бюджэту грамадскім аб'яднанням могуць выдаткоўвацца толькі па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

— Фінансавае ўпраўленне нам патлумачыла, што, на іх думку, бюджэты КТГСаў павінны ўтварацца за кошт добраахвотных мэтавых узносаў грамадзян, спонсарскай дапамогі прадпрыемстваў і ўстаноў адпаведнага мікрараёна, — адзначыў Міхаіл Савановіч. — Але на практыцы гэта не прымяняецца. Мы — дэпутаты гарадскога Савета — усё ж хочам унесці дапаўненні ў новае Палажэнне аб КТГСах, дзе б прадугледжвалася нейкая матэрыяльная дапамога. Цяпер кансультуемся па гэтым пытанні з юрыстамі, знайшлі падтрымку сваёй ініцыятывы з боку членаў Савета Рэспублікі і Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. На бліжэйшай сесіі гарсавета мы разгледзім праект новага Палажэння.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Ва ўмовах, калі трэба эфектыўна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі, неабходна ўзмацняць і грамадскі кантроль за іх расходаваннем (будаўніцтвам інфраструктуры, правядзеннем капрамонтаў і г.д.), — дадаў Георгій Козел. — Мы, мясцовая ўлада, максімальна зацікаўлены ў тым, каб у нас існавалі моцныя, жыццядзейныя КТГСы. Ролю КТГСаў цяжка пераацаніць. Але трэба разумець, што любая сістэма грунтуецца на трох «кітах»: кадрах, структуры і фінансах. І калі КТГС як арганізацыя створаны, людзі падабраныя, а фінансавай падтрымкі няма, то — давайце будзем шчырымі — значнага плёну не будзе. На падтрымку камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання патрэбны невялікія сумы. І сёння, укладваючы сродкі ў пытанні самаарганізацыі людзей, горад атрымае значна больш, чым затраціць.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

# «ШЛЯХ ДА ПАПРАЎКІ МОЖНА СКАРАЦІЦЬ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Звароты прадпрымальнікаў да свайго выбранніка дэманструюць, што поле для ўдасканалення заканадаўства ёсць. Возьмем, напрыклад, арганізацыі, якія атрымліваюць энергію па сетках, што належаць нейкаму прадпрыемству. Канкрэтны алгарытм разлікаў у такой сітуацыі не замацаваны заканадаўча. І ўладальнікі сетак не ўпускаюць шанцу скарыстацца сваім, па сутнасці, манапольным становішчам і... заламіць цану. Тарыфы па розных прадпрыемствах вар'іруюцца ад 10 да 100 працэнтаў ад затрат. І часта гэта залежыць выключна ад асабістых стасункаў уладальніка і карыстальніка, а не ад закона. На думку прадпрымальнікаў, такі прававы прабел трэба запоўніць.

> **«У нас дагэтуль няма закона аб спонсарскай дапамозе. Прадпрыемствы і рады б яе аказаць, але на іх шляху ўзнікае столькі бюракратычных перашкод, што нават цяжка ўявіць.**

— Добра наладжаныя ў нас кантакты з бізнэс-саюзамі, — дадае парламентарый. — Мы абмяркоўвалі з імі нацыянальную платформу бізнэсу: раіліся, як можна трансфармаваць іх прапановы, каб яны не засталіся на паперы, а ўвайшлі ў тыя ці іншыя ўрадавыя праграмы. Кантакты з прадстаўнікамі саветаў па развіцці прадпрымальніцтва дапамагаюць мне сфарміраваць уяўленне аб тэндэнцыях удасканалення заканадаўства ў гэтай галіне — усё ж у профільнай камісіі парламента працую.

Аднак самай балючай для народнага выбранніка застаецца жыллёвая праблема:

— Нягледзячы на тое, што мы будуем шмат жылля, чарга ў нас рухаецца не вельмі хутка. Калі ў 2008 годзе ў Заводскім раёне сталіцы ўводзілі каля 30 тысяч квадратных метраў, то ў мінулым годзе — ужо за 80 тысяч. Задача ж ставіцца — 100 тысяч і больш. Неабходна, каб з гэтай дынамікай росту вязалася і дынаміка выдаткавання кватэр. Скажам, калі будуецца ў два разы больш квадратных метраў, то варта, каб гэта адбівалася і на прасоўванні чаргі. Мы, дэпутаты, у хуткім часе будзем сустракацца з новым намеснікам старшыні гарвыканкама, які курыруе менавіта будаўнічы комплекс. Абавязкова паставім перад ім гэта пытанне. Грошы ўкладваюцца велізарныя, будоўля ідзе маштабная, адпаведным павінен быць і эфект. Чарга павінна прыкметна рухацца. Ёсць пытанні і па жыллі, якое даецца ўзамен знесенага. Разведзеным грамадзянам чамусьці зноў прапануюць агульную кватэру. Гэта, я лічу, няправільна. Заканадаўства тут трэба неяк удасканальваць. Пакуль не магу прапанаваць дакладны рэцэпт, як гэта зрабіць, — ёсць нагода для развагі. Але ў адным мая пазіцыя катэгарычная: новае павінна паляпшаць умовы жыцця людзей. Для таго мы і працуем.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# Добраахвотна ці прымусова?

**Чалавек з асяродку медыцынскіх работнікаў г. Орша, які папрасіў не называць яго прозвішча, выказаў наступную скаргу: гарадская суполка Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа завышае суму добраахвотных грашовых ахвяраванняў з урачоў. Кожнаму доктару ў Оршы прапануюць здаць 10 тысяч рублёў, спасылаючыся на тое, што таварыства Чырвонага Крыжа мае непасрэднае дачыненне да медыцыны.**

Але гэтыя спасылкі не спынілі нараканняў «нізоў» на велічыню ўзносу. Урачы кажуць, што гэта не адзіны від збору. Не праходзіць месяца без патрабаванняў ахвяраваць грошы то на таварыства, то на аб'яднанне. І галоўнае, невядома, на якія мэты выкарыстоўваюцца сродкі, што збіраюцца ў горадзе. Няма, маўляў, «празрыстасці».

Па каментарый мы звярнуліся да старшыні Аршанскай гарадской суполкі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Галіны Казловай.

Яна растлумачыла, што памер узносу вызначаецца на абласным узроўні — таварыствам і ўпраўленнем аховы здароўя. Такім чынам, вызначаны наступныя сумы ахвяравання: для ўрачоў — дзесяць тысяч рублёў, для медсясцёр— сем, для ўсіх іншых работнікаў медыцыны — пяць тысяч рублёў. З медыцынскага персаналу горада трэба сабраць суму ў 24 мільёны рублёў.

Іншым катэгорыям работнікаў (на прадпрыемствы і ў арганізацыі) даведзены «план» па зборы 26 мільёнаў (з кожнай асобы — па тры тысячы пяцьсот рублёў). У калектывах прадпрыемстваў на агульных сходах іншы раз вызначаюць меншую суму. Ёсць прадпрыемствы, дзе прынялі рашэнне выдаткаваць па дзве тысячы рублёў з работніка.

— Сёлета ў цэлым па горадзе запланавана сабраць 50 мільёнаў рублёў. Летась было крыху менш — 42 мільёны. Нараканні медыкаў на высокую суму ўзносу гучалі ўжо тады. Сёлета да мяне непасрэдна звярталіся ад калектыву стаматолагаў, былі адпаведныя званкі і ад медсясцёр, — расказала Галіна Казлова. — Наперадзе ў нас з'езд грамадскасці, аб'яднанай у таварыства «Чырвонага Крыжа» , які плануецца на май месяц. Будзе магчымасць агучыць нашы праблемы.

Старшыня таварыства расказала, што ў мінулыя гады грошы, якія аршанцы ахвяруюць на Чырвоны Крыж, паступалі на гарадскі разліковы рахунак таварыства. Частка з іх пералічвалася ў вобласць, частка заставалася ў распараджэнні горада. З тых грошай маглі выдзеліць хоць невялікую матэрыяльную дапамогу пажылым адзінокім людзям, ветэранам вайны і працы. Летась нават утрымлівалі медсястру, якая абслугоўвала васьмярых пажылых людзей на даму.

Сёлета гарадскі рахунак ліквідавалі. Цяпер грошы, якія сабралі ў калектывах прадпрыемстваў і арганізацый, паступаюць у банк на рахунак абласнога таварыства Чырвонага Крыжа. А каб стаўка медсястры засталася пры гарадской суполцы, трэба шукаць іншыя грашовыя крыніцы.

Галіна Пятроўна распавяла, што дзякуючы праектам і праграмам, у якіх удзельнічала таварыства, летась аказалі матэрыяльную дапамогу 647 малазабяспечаным сем'ям з Оршы. Дапамаглі ім адзеннем, абуткам, прадуктамі харчавання, а інвалідаў забяспечылі каляскамі.

**Вольга ШУТАВА.**


## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### 7 апреля 2011 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды, (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пересечение ул. Ефремова – пр-та Космонавтов | 340100000003002359 | 0,0024 | установка рекламного светодиодного экрана | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 119 691 | 488 186 | 48 800 |
| 2 | ул. Ильича, в районе кинотеатра «Мир» | 340100000007005658 | 0,0015 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ораничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0010 га. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 096 673 | 311 339 | 31 100 |
| 3 | ул. Ильича, в районе производственного швейного объединения «Гомельчанка» | 340100000007005659 | 0,0024 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи, водопровода, канализации - 0,0024 га. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 252 396 | 273 986 | 27 300 |
| 4 | ул. Фрунзе | 340100000001004695 | 0,0032 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы, охранная зона подземной кабельной линии связи – 0,0008 га; водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы – 0,0024 га. | 5 | 1 158 782 | 770 452 | 77 000 |
| 5 | позиция 54Б (по генплану второй очереди застройки микрорайона № 19) | 340100000001004763 | 0,0713 | здания специализированного для общественного питания | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. | 30 | 1 498 210 | 44 623 948 | 4 462 300 |
| 6 | ул. Хатаевича | 340100000001002185 | 0,6120 | многофункционального комплекса с паркингом на 300 машиномест | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона водопровода, водоохранная зона затона у судостроительного завода вне прибрежной полосы – 0,0839 га; водоохранная зона затона у судостроительного завода вне прибрежной полосы – 0,5281 га. Победителю аукциона произвести строительство подземного пешеходного перехода через ул. Хатаевича. | 50 | 1 635 842 | 547 429 541 | 54 742 900 |
| 7 | Речицкое шоссе, в районе жилых домов № 119 и № 129 | 340100000006004321 | 0,1821 | здания магазина и кафе | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0104 га; охранная зона канализации, водовода, электрокабеля – 0,0298 га. | 30 | 1 423 309 | 74 479 879 | 7 447 900 |
| 8 | ул. Войсковая (бывшая территория воинской части) | 340100000006004287 | 0,3330 | здания специализированного складов | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 50 | 2 448 341 | 136 510 201 | 13 651 000 |
| 9 | пр-зд Орудийный (участок № 1) | 340100000007004921 | 0,5381 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0128 га. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 20 | 587 480 | 69 399 094 | 6 939 900 |
| 10 | Речицкое шоссе (в районе котельной и жилого дома № 27) | 340100000006004172 | 0,0137 | размещения павильона по оказанию услуг населению | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализации, теплотрассы, электрокабеля – 0,0048 га. | 10 | 1 545 604 | 4 161 519 | 416 100 |
| 11 | ул. Добрушская (станция техобслуживания) | 340100000008001613 | 0,4505 | станции техобслуживания | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ораничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0168 га; водопровода – 0,0163 га. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. | 20 | 2 532 588 | 87 694 124 | 8 769 400 |
| 12 | ул. Дорожная (в районе пешеходного моста) | 340100000008001760 | 0,0790 | павильона по оказанию услуг населению (резка стекла) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи и водопровода – 0,0227 га. | 5 | 923 705 | 15 084 681 | 1 508 400 |
| 13 | ул. Мазурова в микрорайоне № 19 (участок № 1 и участок № 2) | 340100000001004200<br>340100000001004201 | 0,1189<br>0,0377 | оздоровительного центра (медицинские услуги, парикмахерская, фотоуслуги, ателье, цветочный магазин) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: участок № 1 – охранная зона канализации – 0,0038 га, охранная зона подземной кабельной линии связи, подземной кабельной линии электропередачи – 0,0196; участок № 2 – охранная зона канализации – 0,0041 га. | 50 | 624 661 | 149 165 750 | 14 916 500 |
| 14 | ул. Чечерская (микрорайон № 21) | 340100000002004625 | 0,0305 | здания специализированного здравоохранения и предоставления социальных услуг (аптека) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы – 0,0040 га. | 30 | 1 020 365 | 14 956 660 | 1 495 600 |
| 15 | ул. Текстильная | 340100000003001800 | 0,6789 | здания многофункционального назначения (станция техобслуживания, салон автомобилей, офисный центр, торговый центр с промышленной группой товаров) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,1460 га; охранная зона водовода – 0,0310 га. Выполнить технические условия по выноске КЛ и водовода. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 30 | 581 818 | 375 030 402 | 37 503 000 |
| 16 | ул. Мазурова | 340100000001003288 | 2,7581 | культурно-развлекательного оздоровительного центра «Аквапарк» | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водоохранная зона оз. Бурое Болото – 0,0811 га; водоохранная зона оз. Бурое Болото – 1,7335 га; прибрежная полоса оз. Бурое Болото – 0,9435 га. | 30 | 2 441 250 | 1 215 491 893 | 121 549 100 |
| 17 | микрорайон № 18 | 340100000001004833 | 0,8091 | детского сада | | Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Участок ограничений в использовании не имеет. | 50 | 1 779 404 | 892 177 857 | 89 217 780 |
| 18 | ул. Механическая (район конечной остановки автобуса) | 340100000002004889 | 0,0541 | здания специализированного торговли продовольственными товарами | | участок свободен от застройки. Ограничения в использовании: охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 0,4 кВ – 0,0021 га. Условия: плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 30 | 1 757 482 | 21 489 513 | 2 148 900 |
| 19 | ул. Карповича (район жилого дома № 17) | 340100000001004886 | 0,0072 | для размещения торгового павильона по продаже духовной литературы и сопутствующих церковных товаров | | участок свободен от застройки. Ограничений в использовании нет. Условия: плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 2 049 488 | 2 101 971 | 210 100 |
| 20 | ул. Хатаевича (район жилых домов №№ 59-61) | 340100000001004902 | 0,0389 | административного здания | | участок свободен от застройки. Ограничения в использовании: охранная зона водопровода, канализации, подземной кабельной линии электропередачи, линни связи – 0,0100 га; охранная зона канализации – 0,0028 га. Условия: плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 50 | 2 349 847 | 43 264 864 | 4 326 400 |
| 21 | ул. Хатаевича (район жилых домов №№ 59-61) | 340100000001004903 | 0,0240 | здания специализированной торговли непродовольственными товарами | | участок свободен от застройки. Ограничения в использовании: охранная зона канализации – 0,0018 га. Условия: плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 30 | 2 185 401 | 17 567 901 | 1 756 700 |
| 22 | ул. Хатаевича (район жилых домов №№ 33-35) | 340100000001004887 | 0,0289 | здания специализированного торговли непродовольственными товарами | | участок свободен от застройки. Ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы – 0,0008 га. Условия: плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 30 | 1 793 530 | 21 105 889 | 2 110 500 |
| 23 | ул. Бочкина (в районе жилого дома № 27 по ул. Владимирова) | 340100000005005803 | 0,0018 | для размещения торгового киоска | | плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 554 290 | 313 834 | 31 380 |
| 24 | ул. 60 лет СССР ( в районе жилого дома №11) | 340100000006004355 | 0,0018 | для размещения торгового киоска | | плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 816 489 | 414 712 | 41 470 |
| 25 | ул. Богданова | 340100000003002416 | 0,0024 | установка и обслуживание торгового киоска | | ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0008 га. | 5 | 532 059 | 488 998 | 48 800 |
| 26 | микрорайон «Энергетиков», вблизи жилого дома № 29, участок 1 | 340100000005005801 | 0,0012 | торгового киоска | | плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 176 340 | 64 870 | 6 480 |
| 27 | микрорайон «Энергетиков», вблизи жилого дома № 29, участок 2 | 340100000005005802 | 0,0012 | торгового киоска | | плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 5 | 1 117 406 | 64 870 | 6 480 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 7 апреля 2011 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 1 апреля 2011 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Лоты №№ 1–17, 23–27 выставляются на аукцион повторно: извещения опубликованы в газете «Звязда» 01.12.2010 г., 01.02.2011 г.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by**


# Замежныя турысты палююць у Беларусі

**Лесапаляўнічыя гаспадаркі Мінлясгаса ў студзені гэтага года атрымалі 419 млн рублёў даходаў ад паляўнічага турызму і эксплуатацыі паляўнічых комплексаў. Гэта болей чым у 2 разы перавысіла планы. 195 млн рублёў з гэтай сумы ўнеслі замежныя турысты.**

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі Беларусі, у 2011 годзе ад вядзення паляўнічай гаспадаркі чакаецца атрыманне 7,6 млрд рублёў, у тым ліку ад правядзення паляўнічых тураў з удзелам замежных грамадзян — 2,58 млрд, ад эксплуатацыі паляўнічых домікаў — 1,9 млрд рублёў. У 2010 годзе ад правядзення паляўнічых тураў з удзелам замежных грамадзян лесапаляўнічымі гаспадаркамі атрымана 1 млрд 960 млн рублёў пры плане 1 млрд 329 млн рублёў.

**Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».**


МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ. Газета для выбарнікаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**

**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.**

Прамая лінія

# І ГАЛАВА КРУЖЫЦЦА, І Ў СПІНЕ «СТРАЛЯЕ»

**На пытанні чытачоў адказаў загадчык неўралагічнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр ІВАНОЎ.**

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 1—2 сакавіка.)*

***☎— Дзяржынск, Юлія. 50 гадоў. Раптоўна з'явіўся боль у тазасцегнавым суставе левай нагі. Прымала найз 5 дзён. Быццам, дапамагло. Але, калі перастала прымаць прэпарат, боль вярнуўся. Ці можна зноў пачаць лячэнне найзам?***

— Найз — гэта нестэроідны супрацьзапаленчы прэпарат. Ён мае як станоўчыя, так і адмоўныя ўласцівасці. Калі той станоўчы эфект, які прыносіць найз, з'яўляецца часовым, то працягваць прымаць яго не варта. Трэба прайсці комплекснае лячэнне. Яно павінна ўключаць фізіялагічныя працэдуры — такія, як фонафарэз з гідракартызонам, лазератэрапію. Таксама неабходнае лячэнне нестэроіднымі супрацьзапаленчымі прэпаратамі, лепш мавалісам, мелаксікамам. Я раю вам звярнуцца да рэўматолага, які займаецца паталогіяй суставаў, правесці дадатковае абследаванне і працягнуць лячэнне ў гэтага спецыяліста.

***☎— Смалявіцкі раён, Іван Пятровіч, 73 гады. Моцна баляць калені. Лячэнне, якое прызначаюць у раёне, не дапамагае. Ці можна трапіць на кансультацыю да вас?***

— Усе захворванні, звязаныя з пашкоджаннем суставаў, лечацца ў рэўматолага па месцы жыхарства. Зыходзячы з вашых скаргаў, вам лепш звярнуцца да гэтага спецыяліста.

***☎— Мінск, Таццяна. 29 гадоў. Баліць спіна паміж лапаткамі і ніжэй. Боль з'явіўся пасля працы, якую выконвала, седзячы за нізкім сталом. Ці можа гэта быць прычынай болю і што мне рабіць, каб пазбавіцца ад яго?***

— Няправільная поза падчас працы можа садзейнічаць болю. Перш чым пачаць лячэнне, я б параіў вам звярнуцца да неўролага. Але папярэдне магу сказаць, што пры такіх скаргах можна карыстацца мазямі найз, румакар, індаметацынавай. Паспрабуйце прымаць прэпарат маваліс — 15 мг па адной таблетцы ў суткі на працягу 5 дзён. Добра было б далучыць фізіятэрапію пасля кансультацыі з фізіятэрапеўтам. І калі боль не знікне, тады прайсці стацыянарны курс лячэння.

***☎— Бярэзінскі раён, Надзея Іванаўна. 67 гадоў. Адчуваю пастаянны шум у галаве. Што рабіць, якія прэпараты прымаць?***

— Лепш, каб вас пагледзеў неўролаг і падабраў вам лекі. З таблетак гэта могуць быць сасудзістыя прэпараты: трантал, вінпацэцін; наатропы — наатрапіл, пірацэтам. Ёсць і іншыя групы.

***☎— Слуцк, Павел Якаўлевіч. 69 гадоў. Боль у шыйных пазванках, кружыцца галава, калі ўстаю з ложка. Ціск то высокі, то нізкі. Прымаў 10 дзён німесулід, луцэтам, кавінтон фортэ. Не дапамагло. Што мне рабіць далей, да якога спецыяліста, можа быць, у Мінску, трэба звяртацца?***

— Галавакружэнне звязана, хутчэй за ўсё, не з болем у шыйным аддзеле пазваночніка, а са спазмам пазваночных артэрый, што часцей прыводзіць да галавакружэння, млоснасці, ванітаў. Паколькі непрыемны сімптом з'яўляецца ў вас пры змене становішча цела, то ў першую чаргу неабходна звярнуць увагу на становішча галавы падчас сну. Рэкамендую вам спаць на нізкай, а лепш за ўсё, на спецыяльнай анатамічнай падушцы (аб тым, дзе іх набыць, можна пацікавіцца ў спецыялістаў-артапедаў).

Другой прычынай галавакружэння ў вашым узросце можа быць атэрасклероз сасудаў галаўнога мозгу. Тады варта прымаць такія прэпараты, як бетасерк — 48 мг аднаразова ў суткі або 24 мг двойчы ў дзень, або па 16 мг тройчы ў дзень; серміён — 10 мг 3 разы ў дзень, вінпацэцін. Трэба памятаць, што серміён уплывае не толькі на стан сасудаў, але і рэгулюе артэрыяльны ціск. Лепш за ўсё ў вашай сітуацыі звярнуцца да неўролагаў па месцы жыхарства. Я ведаю, што ў Слуцку добрая неўралагічная служба. Калі будзе патрэба, вас накіруюць у медустанову больш высокага ўзроўню.

***☎— Мінск, Міхаіл Іванавіч. 70 гадоў. Збіраюся на медэкспертную камісію. Ёсць праблемы з пазваночнікам — грыжа дыска, радыкуліт. Трэба прайсці магнітна-рэзанансную тамаграфію. Дзе гэта можна зрабіць?***

— Якім павінна быць ваша абследаванне, павінен вырашыць урач-неўролаг. Магчыма, вам дастаткова будзе правядзення рэнтгеналагічных здымкаў. Тамаграфія — зусім не бяспечны від абследавання, таму бескантрольна яго рабіць не пажадана. Звычайна, калі пацыента накіроўваюць на МРЭК, то вызначаюць яму і аб'ём даследаванняў, якія трэба правесці.

***☎— Мазыр, Іван Адамавіч. 70 гадоў. У 2009 годзе страціў нюх, у 2010 годзе — пачуццё смаку, пачала трэсціся правая рука і галава. Дыягназ — атэрасклероз па тыпе абсансаў... Перыядычна неўролаг мне выпісвала таблеткі. Сёлета мяне аднойчы добра «павяло», «хуткая» дала пірацэтам. Неўролаг выпісаў дэпакін, вінпацэцін, мексібел. П'ю тыдні тры, але мяне ўсё роўна «водзіць», паляпшэння стану не назіраецца. Ці існуе больш эфектыўнае лячэнне?***

— Атэрасклероз сасудаў галаўнога мозгу з абсансамі аналагічны эпілептычным прыпадкам, толькі яны не суправаджаюцца стратай прытомнасці. Чалавек, што называецца, застывае на некалькі секундаў, пасля чаго не памятае, што з ім было ў гэтыя секунды. Хутчэй за ўсё, абсансы звязаныя з атэрасклератычным пашкоджаннем галаўнога мозгу. Прэпарат дэпакін — супрацьсутаргавы... Паколькі вы маеце ачаговую сімптаматыку — парушэнне смаку, нюху, то для выключэння больш сур'ёзнай неўралагічнай паталогіі вы павінны прайсці больш дэталёвае абследаванне па месцы жыхарства. Рэкамендаваць вам лячэнне з улікам такой вялікай неўралагічнай сімптаматыкі мне не хацелася б. Лячэнне павінна адпавядаць вынікам таго абследавання, якое вы пройдзеце.

***☎— Магілёўская вобласць, Андрэй Мікалаевіч. 86 гадоў. Гады, можа, чатыры пакутую ад хваробы Паркінсона. У верасні мінулага года неўролаг прапісаў наком. Аднак праз 5-6 дзён прыёму я перастаў спаць, абвастрылася бранхіяльная астма. Кінуў піць таблеткі, але хвароба Паркінсона прагрэсуе, хадзіць магу толькі з дзвюма кавенькамі, а цемначы дык проста падаю. Што вы параіце з улікам маіх хранічных хваробаў — у першую чаргу астмы і адэномы, якія мяне асабліва непакояць?***

— Існуе сапраўдная хвароба Паркінсона і сімптаматычная, сіндром паркінсанізму, што можа сустракацца пры атэрасклерозе сасудаў галаўнога мозгу, траўмах, энцэфалітах і інтаксікацыях. Хвароба Паркінсона пачынаецца паступова, часцей за ўсё спачатку пашкоджваецца адна рука і адна нага, а затым далучаюцца ўсе іншыя сімптомы. Для лячэння хваробы існуе некалькі груп прэпаратаў, адна з якіх — дофазамяняльныя прэпараты, медыятары. У норме дафамін выпрацоўваецца ў глыбінных аддзелах галаўнога мозгу і рэгулюе мышачны тонус. Калі ж дафаміну недастаткова, з'яўляецца дрыжанне і некаторыя іншыя сімптомы.

Пры выяўленні хваробы Паркінсона ўрач павінен падабраць неабходнае лячэнне. Калі вы прынялі наком адразу ў вялікай дозе — па 250 мг 3-4 разы ў дзень, то такое прызначэнне можа выклікаць пагаршэнне стану. Наком прызначаецца ў дозе 1/4 ад 250 мг 3-4 разы ў дзень з паступовым павелічэннем дозы. Тым не менш, калі вам не падыходзіць наком, можна замяніць яго на іншыя — сінякод або мадапар. Гэтыя прэпараты з'яўляюцца замяшчальнай тэрапіяй, якія выконваюць функцыю дафаміну. Трэба, праўда, улічваць, што са ста працэнтаў лекавага прэпарата ў галаўны мозг пранікне толькі 40. Для ўзмацнення дзеяння накому існуюць іншыя прэпараты — аганісты дафамінавых рэцэптараў, а менавіта мерапекс, пранаран, якія стымулююць існуючыя дафамінавыя рэцэптары і выпрацоўку дафаміну. Ёсць яшчэ такі прэпарат як мідантан — ён спрыяе назапашванню дафаміну пры сінаптычнай мембране.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**

*(Працяг будзе.)*

## Крадзяжы з узломам

**У адзін дзень у Брэсце зафіксавана адразу чатыры крадзяжы з кватэр з узломам. Зламыснікаў не спыняла таўшчыня жалезных дзвярэй: са складанымі замкамі яны спраўляліся надзвычай «прафесійна».**

З кватэры па Валгаградскай зладзеі вынеслі больш за чатыры тысячы долараў, каля шасці мільёнаў рублёў, залатыя рэчы, іншыя каштоўнасці. У трох кватэрах па Мянжынскага таксама прапалі грошы і каштоўнасці. Забіралі і спіртныя напоі, упрыгажэнні. Некалькі гадоў таму па Брэсце пракацілася хваля кватэрных крадзяжоў з падобным почыркам. Тады міліцыя затрымала адразу некалькі злачынных «брыгад» з іншых рэгіёнаў Беларусі.

**Яна СВЕТАВА.**

## Да браканьера прывялі сляды трактара

**Работнікі Любанскай міжрайінспекцыі сумесна з супрацоўнікамі Любанскага лясгаса ў паляўнічых угоддзях гэтага карыстальніка — на мяжы з угоддзямі суседніх «Ляскавіч» — знайшлі сляды незаконнага палявання: рэшткі лася і сляды трактара.**

Апошнія вялі ў вёску Ветчын Жыткавіцкага раёна да дома мясцовага жыхара. У яго двары ўжо супрацоўнікі міліцыі ўбачылі МТЗ-80 без рэгістрацыйнага нумара з прычэпам, на якім былі знойдзеныя сляды крыві. Было высветлена, што лася незаконна здабыў родны брат месціча, які нідзе не працуе. Незарэгістраваная паляўнічая стрэльба і мяса канфіскаваныя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Жылплошча

# ЦІ ЎВАХОДЗІЦЬ РАМОНТ ПАД'ЕЗДА Ў ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ?



Чытачка Марына з вул. Нікіфарава ў г. Мінску сцвярджае, што рамонту ў іх не было вось ужо 21 год.

Пытанні наконт тэхнічнага абслугоўвання не перастаюць бянтэжыць нашых чытачоў. «Нашаму дому больш за 21 год. І ні разу за гэты час у нас не рабіўся рамонт пад'езда, — расказала па тэлефоне чытачка Марына, што жыве па сталічнай вуліцы Нікіфарава. — Пару разоў мянялі лінолеум у ліфце. А зараз да нас прыйшлі прадстаўнікі ЖЭСа і прапанавалі за наш кошт зрабіць рамонт пад'езда. Маўляў, яны за свае грошы толькі першы паверх змаглі замазаць. Чула, што рамонт пад'езда павінен рабіць ЖЭС з рэгулярнасцю раз у пяць гадоў. І толькі калі жыльцы хочуць зрабіць часцей, то яны павінны «скідвацца». А нашто ўвогуле тады мы плацім за тэхнічнае абслугоўванне?»

Праясніць сітуацыю «Звязда» папрасіла **начальніка аддзела жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ Эдмунда ГРЫШКЕВІЧА.**

— Разумееце, грошы, якія вы плаціце за тэхабслугоўванне, не ідуць на рамонт пад'езда, — тлумачыць спадар Грышкевіч. У тэхнічнае абслугоўванне ўваходзіць усё, што датычыцца ўтрымання дома. Гэта прыбіранне месцаў агульнага карыстання, тэрыторыі, пад'ездаў. Тэхнічнае абслугоўванне ўсяго інжынернага абсталявання. Гэта сантэхніка і электрычнае абсталяванне, а таксама аварыйнае абслугоўванне і інш. Па адной прыборцы па горадзе Мінску я налічыў 26 відаў работ. Асноўныя — санітарнае ўтрыманне домаўладання, г.зн. дворнік павінен падмесці асфальт і тэрыторыю каля дома. Сюды таксама адносіцца скошванне травы, выдаленне смецця са смеццепрымальнай камеры, прыборка снегу зімой, пасыпанне тэрыторыі супрацьгалалёднымі сродкамі. Не забудзем пра вільготнае падмятанне лесвічнай пляцоўкі — 1 раз на дзень, мыццё і дэзынфекцыю лесвічнай пляцоўкі — адзін раз на тыдзень, мыццё вокнаў — два разы на год.

У тэхнічнае абслугоўванне ўключаны тэхнічны агляд і абслугоўванне тэхнічных элементаў будынка. Той жа дах нехта павінен абследаваць і сачыць, каб ён быў у нармальным стане.

Вы плаціце і за тэхнічны агляд дзвярных і аконных запаўненняў, унутранай і знешняй тынкоўкі, дзіцячай пляцоўкі. Нехта павінен пагледзець, вісяць арэлі ці не, у якім яны стане. Тое самае і з завозам пяску, афарбоўкай і г.д.

Гэта таксама агляд інжынерных сістэм — цэнтральнай сістэмы водазабеспячэння, ацяпляльных прыбораў, запорна-рэгулюючай арматуры, сістэмы водаадвядзення, цеплаізаляцыі, а таксама воданагравальнікаў, гідраўлічных сістэм, стан электраправодкі гарышчаў ды падвалаў. А таксама паказанні кантрольна-вымяральных прыбораў.

Возьмем плату за тэхнічнае абслугоўванне. Напрыклад,120 кватэр, калі ў сярэднім узяць па 50 кв.м, то будзе 6000 кв м. Памнажаем гэтую лічбу на 309, атрымліваем каля 1,9 млн руб. у месяц. Прыбіральшчыцы патрэбна мінімум 600 тыс., пасля туды трэба дадаць 140 тысяч на сацстрах. Халат трэба раз у год купіць, вядро, мяцёлку, ваду трэба аплаціць. І атрымаецца каля 800—900 тыс. Засталося 1,1 млн. Пасля пайшлі выдаткі на электрыка, сантэхніка і г.д. Вось куды ідуць вашы грошы. Нічога лішняга не траціцца, таму грошай на рамонт пад'ездаў у ЖЭСаў не хапае. З-за гэтага і была прыдумана такая форма, як долевы ўдзел жыхароў у рамонце. Вы можаце за свой кошт зрабіць сабе чысціню, а можаце пачакаць капітальнага рамонту.

***У мяне маленькае дзіця (1,4 года). Суседзі знізу робяць рамонт, пастаянна гудзе дрыль. А дзіця спіць прыкладна з 13.00 да 15.00. На просьбу жонкі не свідраваць яе ў літаральным сэнсе паслалі на тры літары. Ці існуюць нормы для правядзення рамонтных работ у кватэры? І што рабіць у такіх выпадках?***

**Вадзім**, *Брэст*

— Згодна з пастановай Савета Міністраў 31.12.2008 праводзіць рамонтныя работы можна з 9.00 да 19.00 у працоўныя дні. Так што фактычна ваш сусед нічога не парушае. Аднак калі сітуацыя становіцца крытычнай, можаце патэлефанаваць у ЖЭС, каб прыйшлі і правялі прафілактычную размову.

***— Я і мая сяброўка жывём у абсалютна аднолькавых кватэрах у тыпавых дамах. Аднак чамусьці нам прыходзяць розныя сумы на ацяпленне. Мы абслугоўваемся ў ЖЭСе. У чым прычына?***

**Таццяна**, *Гомель*.

— Розніца ў аплаце можа быць з-за рознага стану дамоў, — адказаў **Аляксандр МАРКЕВІЧ, дырэктар інстытута «Белжылпраект».** — Ад таго, наколькі якасна і добра праводзіцца эксплуатацыя дома, наколькі добра адрэгуляваныя яго сістэмы, залежыць і эканомія цяпла. Таксама на цепластраты ўплывае якасць правядзення бягучага і падтрымальнага рамонту. У адным доме, магчыма, даўно труба была зламаная, і вада зацякала паміж стыкамі. Гэта так парушыла канструкцыю, што яна стала больш цяпла праводзіць. Яшчэ ўплывае адзін момант — рэгуляванне сістэмы. Не заўжды злёту атрымліваецца. Таму дзесьці перапал бывае. Таксама, калі стаіць аўтаматыка, то розныя віды прыбораў законна маюць розныя пагрэшнасці: у аднаго плюс тры адсоткі, а ў другога мінус тры адсоткі. А розніца ж ужо шэсць адсоткаў...

***На працягу якога часу ЖЭС павінен адрэагаваць на заяўку (пакідала заяўку на прыёме ў дырэктара)?***

**Алена,** *Бяроза, Брэсцкая вобл.*

— Нейкага спецыяльнага дакумента, які б рэгламентаваў час прыходу таго ж сантэхніка ці электрыка, няма. Ёсць проста аварыйныя заяўкі, на якія мы рэагуем, па магчымасці вельмі хутка, — патлумачылі ў ЖРЭА Першамайскага раёна сталіцы. — Па звычайнай заяўцы час прыходу вы ўдакладняеце індывідуальна. Ці вам яго паведамляюць у дыспетчарскай службе, дзе рэгіструюць вашу заяўку (не забудзьце запісаць рэгістрацыйны нумар, час і дату заяўкі). Калі вы пакінулі заяўку, аплацілі, але ніхто да вас не прыйшоў, то можаце пісаць скаргу ў ЖЭС на падставе квітанцыі аб аплаце.

*Калі ў вас ёсць што спытаць ці падзяліцца праблемай, можаце пісаць на электронныя скрыні info@zyazda.minsk.by, nastazanko@gmail.com з паметкай «Жылплошча» альбо тэлефанаваць па нумары 8 (017) 287 18 64.*

**Настасся ЗАНЬКО.**

Падрабязнасці

# Музычная вандроўка на радзіму Рыгора Пукста



**Хойнікі, адзін са старажытных гарадоў Гомельшчыны, які ў наступным годзе будзе адзначаць 500-гадовы юбілей, сёлета прыняў заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Рэспублікі Беларусь прафесара Міхаіла Фінберга, вядомы не толькі на Беларусі, але і ў многіх краінах свету.**

Можна лічыць, што свята беларускага мастацтва пад назвай «Музычныя краявіды Хойніцкай зямлі» стала працягам рэспубліканскага Дня беларускага пісьменства, які праходзіў тут летась. Галоўная мэта музычнага фэсту — не толькі сустрэча з музыкамі, але і знаёмства са спадчынай знакамітых прадстаўнікоў айчыннага мастацтва, чыё жыццё і мастацкая дзейнасць былі звязаны з Гомельшчынай. Аналагічныя мерапрыемствы па малых гарадах Гомельшчыны не першы год праходзяць з вялікім поспехам. Вядомыя «Чачэрскія сустрэчы», імпрэза камернай і духоўнай музыкі ў Тураве і вось — свята «Музычныя краявіды Хойніцкай зямлі».

Для навучэнцаў мясцовай школы мастацтваў музычныя краявіды пачаліся з майстар-класа, на якім майстры мелі самыя цесныя стасункі з тымі, хто робіць толькі першыя крокі ў спасціжэнні музычнага свету. І гэты вопыт важны не толькі для дзяцей, якія «заражаюцца» любоўю да музыкі ад знакамітасцяў. Справа ў тым, што і майстры скрыпкі, флейты ці дырыжорскай палачкі прыглядаюцца да тых, хто, магчыма, прыйдзе працаваць у іх калектыў заўтра. Тым больш, Міхаіл Фінберг сцвярджае, што большасць удзельнікаў яго калектыву — менавіта з глыбінкі. На яго погляд, людзі з маленькіх гарадоў больш адказна адносяцца да працы. Сам маэстра нарадзіўся ў суседнім, Мазырскім раёне, таму з асаблівай цеплынёй, зноў сустракаецца з Гомельшчынай:

— Мы шукаем новыя таленты. Кампазітары сёння практычна не пішуць музыку для дзяцей. Артысты выступаюць пад фанаграммы, якія запісаны няякасна, у якіх вельмі шмат музычных памылак. Самае галоўнае на сцэне — кароткая спадніца. Няма нацыянальнага. Таму нам складана сёння прывіваць сапраўдны густ да сапраўднай музыкі. Я паспрабаваў зрабіць фестываль, які меў назву «Спяваем з аркестрам». Але ж праз тры-чатыры гады пайшлі паўторы — таму я адмовіўся ад гэтага. Мая задача ў мастацтве — ісці толькі наперад. Мне будзе сорамна, калі мы будзем падманваць гледача. Таму сёння вялікая праблема — пошук новых талентаў. Калі я чую па радыё ці тэлебачанні сучасную музыку, мне бывае сумна, бывае гідка. Наша акцыя асветніцкая. Памятаеце, калісьці была практыка на вялікіх прадпрыемствах у час абедзеннага перапынку для людзей ад станка праводзіць канцэрты сімфанічнай музыкі. Гэта аналагічна таму, як Шульжэнка ці Уцёсаў падчас вайны выступалі на перадавой, што натхняла людзей на перамогу над ворагам. Я перакананы, што такая акцыя станоўча ўплывае на маладое пакаленне. Калі некалькі чалавек сталі лепшымі пасля нашых сустрэч, мы са сваёй працай справіліся.

«Вяртанне на радзіму» — так назвалі праграму канцэрта класічнай музыкі, з якім аркестр Міхаіла Фінберга выступіў у Хойніках. Праграма складзена па творах знакамітага земляка, кампазітара Рыгора Пукста, які нарадзіўся 110 гадоў таму. Але ж жыхары невялічкага гарадка, які звычайна меў нядобрую славу аднаго з так званых «чарнобыльскіх» рэгіёнаў, сталі ўдзячнымі слухачамі не толькі класікі, але і гледачамі на канцэрце сучаснай эстраднай песні «Лепшае» — з удзелам народнага артыста Беларусі Мікалая Скорыкава. Прынамсі, таксама земляка.

Жыхары Хойнік спадзяюцца, што фестываль у іх прыжывецца і стане традыцыйным. Мясцовыя ўлады паабяцалі, што зробяць для гэтага ўсё магчымае.

— Праз культуру мы становімся іншымі людзьмі, — падкрэслівае прафесар Міхаіл Фінберг. — Мы будзем больш паважаць адно аднаго, будзем ганарыцца тым, што ў нас ёсць. Галоўнае — мы будзем сябраваць. Больш за 200 чалавек працуе ў калектыве — камерны хор, струнны аркестр, ансамбль флейтыстаў, трубачоў... І, безумоўна, вялікі аркестр. Мы штогод рыхтуем амаль 30 новых праграм, 15 фестываляў у невялічкіх населенных пунктах. Гэты — 124 фестываль, які мы ладзім у маленькіх гарадах. Не лічачы «Славянскага базара». Да сёлетняга мы пачалі ўжо рыхтавацца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Першага красавіка завяршаецца прыём дакументаў у ваенныя навучальныя ўстановы

**Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў палкоўнік Генадзь Ляпешка, начальнік упраўлення ваеннай адукацыі і падрыхтоўкі войскаў Узброеных Сіл РБ.**

— Тым, хто хоча стаць абітурыентамі ваенных навучальных установаў, да першага красавіка патрэбна падаць заяву ў ваенны камісарыят раёна ці горада па месцы жыхарства, — паведаміў Генадзь Ляпешка. — Нагадаю, што ў ваенныя ўстановы прымаюцца грамадзяне з сярэдняй адукацыяй ва ўзросце ад 17 да 21 года.

На пытанне, ці магчыма атрымаць адукацыю ў ваенных установах платна, палкоўнік Ляпешка адказвае адмоўна.

— У нас такое пытанне нават не разглядалася, — тлумачыць ён. — У шэрагу краін такая магчымасць ёсць. Напрыклад, у Харкаўскім універсітэце паветраных сіл ёсць два факультэты, у якіх навучанне ажыццяўляецца платна. Аднак, паўтаруся, у нас пакуль прыём ідзе толькі на бюджэтныя месцы.

Для паступлення ў ваенныя навучальныя ўстановы патрэбна прайсці медыцынскую камісію, здаць цэнтралізаванае тэсціраванне і фізічныя нарматывы ўжо ў самой навучальнай установе.

Падрыхтоўкай ваенных у Беларусі займаецца Ваенная акадэмія, ваенныя факультэты ў шасці ўніверсітэтах — Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце радыёфізікі і электронікі, Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ім. Я. Купалы, а таксама ваенны факультэт у Мінскім дзяржаўным вышэйшым авіяцыйным каледжы. Акрамя гэтага, у межах дамоў АДКБ беларускія грамадзяне могуць навучацца і ў ваенных установах Расіі. Штогод каля 300-400 чалавек праходзіць навучанне ў Расійскай Федэрацыі.

— Ваенная Акадэмія, можна сказаць, базавая пляцоўка для падрыхтоўкі ваенных спецыялістаў, — распавядае **палкоўнік Юрый КАКОШКА, намеснік начальніка па вучэбнай працы Ваеннай Акадэміі.** — Акадэмія сёння складаецца з дзевяці факультэтаў, што забяспечваюць падрыхтоўку афіцэрскіх кадраў больш чым па 70 спецыялізацыях і кірунках для Узброеных Сіл і ўнутраных войскаў МУС. З 2003-га года ў нас існуе факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, а з 2006-га — факультэт Генеральнага штаба Узброеных Сіл. Дарэчы, два нашы першыя выпускнікі ўжо атрымалі званне генерал-маёраў. Пяць гадоў таму мы адкрылі магістратуру. У адукацыйным працэсе мы выкарыстоўваем і сучасныя тэхналогіі: Акадэмія мае свае камп'ютарныя класы з доступам у інтэрнэт, а таксама ўласную сетку, у якой студэнты могуць у электронным варыянце спампаваць патрэбныя падручнікі і метадычныя комплексы.

***Больш падрабязна пра правілы прыёму ў ваенныя навучальныя ўстановы можна даведацца на афіцыйным сайце Міністэрства абароны Беларусі — http://www.mod.mil.by у раздзеле «ваенная адукацыя».***

**Настасся ЗАНЬКО.**

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 — № 9 (388)

## Выбірай суседа

**Вядома, што некаторыя расліны цудоўна адчуваюць сябе на адной плошчы з іншымі культурамі. Яны стымулююць адна адну, і ў выніку ўраджайнасць і тых, і іншых павялічваецца. Апроч таго, многія культуры, калі іх пасадзіць разам, лягчэй супрацьстаяць шкоднікам і хваробам. Напрыклад, калі бульбу размяшчаюць разам з фасоляй, морквай, пятрушкай, салатай, кропам, часнаком, цыбуляй, рэдзькай, капустай, яе ўраджай павышаецца. Такім жа будзе эфект, калі бульбу высаджваюць пасля пералічаных культур на наступны год пры змене месцаў на агародзе.**

Каб бульба не цярпела ад фузарыёзнага ўвядання, да яе падсяваюць люцэрну. Дарэчы, люцэрна — прыродная фабрыка па абагачэнні глебы арганічным азотам, які паступае ў глебу непасрэдна з паветра. Яе выкарыстоўваюць як зялёнае азотнае ўгнаенне, і ў гэтай якасці яна стала важным аб'ектам сучасных генетыкаў і селекцыянераў ва ўсім свеце. А вось суседства з таматамі, сланечнікам, агуркамі, гарбузамі (нават у мінулых пасадках) непажаданае. Побач з яблыняй, вішняй, малінай яе таксама лепш не саджаць — ураджай будзе ніжэйшы.

Моркву і цыбулю лепш сеяць на адной градцы, чаргуючы іх радкамі, — так ураджай будзе вышэйшы.

Калі сярод агуркоў пасеяць кроп, павялічваецца працяглась іх пладанашэння, а значыць, і ўраджай. Апроч таго, размяшчаючы побач з агуркамі асобнымі галоўкамі цыбулю і часнок, агуркі можна засцерагчы ад бактэрыёзу.

Таматам добра дапамагаюць яравы часнок і кроп. Можна з гэтай жа мэтай ранняй вясной да высадкі расады пасеяць на адведзеным для таматаў месцы радыску.

Шпінат і маяран сябруюць з радыскай і салатай, прычым салату абавязкова размяшчаюць па краях градак. Добра расце пятрушка з чаберам. Дарэчы, і нарыхтоўваць іх можна разам.

## Гладыёлусы — не толькі ў букеце



Многія садаводы захапляюцца развядзеннем гэтых на дзіва прыгожых кветак, якія доўга радуюць вока кветкамі разнастайных адценняў і лістамі, падобнымі на меч.

А ці ведаеце вы, што гэтыя самыя мячы — выдатны сродак ад бяссонніцы? Калі заварыць лісты гладыёлуса і даць настояцца, то атрымаецца каштоўны вітамінны напой, таму што ў лістах многа вітаміну С.

Гэты напой дапамагае пазбавіцца не толькі ад бяссонніцы — ён лечыць галаўны боль, дэпрэсіі, незаменны пры стрэсах, неўрозах, галавакружэнні, вяласці, страху. Карысны настой і пры празмерных фізічных і разумовых нагрузках, пры паніжаным жыццёвым тонусе.

## Вясна-прыгажуня ўжо ў дарозе

**Хоць на календары ўжо веснавы месяц і зіма паціху здае пазіцыі, але яшчэ нашы продкі не надта давяралі лагоднасці першага вясновага месяца. І народная мудрасць «Марац кусае за палец» апраўдана сёлета, як ніколі. Але снег пачне раставаць ужо ў сакавіку — дзесьці раней, а дзесьці — пазней, і трэба максімальна затрымаць на ўчастку талыя воды. Для гэтага робяць розныя баразёнкі і валікі ўпоперак схілаў. А вось з нізкіх месцаў як мага хутчэй трэба адвесці дажджавую і талую ваду, асабліва з пасадак суніц.**

Сакавік — вельмі небяспечны месяц для пладовых дрэў. Яркае сонца можа выклікаць апёкі кары, таму, калі вы не зрабілі гэтага ў лютым, хутчэй пабяліце ствалы і шкілетныя галінкі дрэў і кустоў. Пабелка таксама засцеражэ расліны ад камедзецячэння і шкоднікаў, якія зімуюць на дрэвах. Клапатлівыя гаспадары ачышчаюць штамбы дрэў ад гнілі і абмерзлай травы, імхоў і лішайнікаў. Раны зачышчаюць да здаровай драўніны, дэзынфікуюць 3-працэнтным растворам меднага купарвасу. Як толькі мінуе небяспека моцных маразоў (ніжэй за 10 градусаў), пачынайце абрэзку пладовых дрэў, яе трэба паспець зрабіць, пакуль не набрынялі пупышкі. Рабіць гэта трэба ў безмарозныя дні, пры тэмпературах, блізкіх да нулявой адметкі.

Уважліва агледзьце пупышкі чорных парэчак. Калі яны не распускаюцца, а толькі надзьмуліся і акругліліся — расліны пашкоджаны кляшчом. Калі на галінцы да 10 такіх пупышак, іх вышчыкваюць, калі больш — выразаюць усю галінку і спальваюць. Выразайце і знішчайце такія расліны на працягу 2—3 гадоў, і вы поўнасцю пазбавіцеся ад гэтага шкодніка без ядахімікатаў.

Агрэст вельмі ўспрымальны да мучністай расы. Хворыя парасткі скрыўляюцца, пакрываюцца белым налётам і прыпыняюць рост. Іх таксама трэба выразаць і спаліць, а здаровыя кусты апырснуць разбаўленым вадой каравякам (1:3).

Агароднікі ў першай палове месяца высяваюць на расаду для адкрытага грунту або пад плёнку насенне памідораў, перцу, сельдэрэю і іншых культур, калі гэтага не зрабілі ў лютым. У другой палове сакавіка высяваюць на расаду насенне ранніх і позніх гатункаў белакачаннай і квяцістай капусты, агуркоў і памідораў.

У сярэдзіне ці ў канцы сакавіка закладваюць на яравізацыю клубні ранніх гатункаў бульбы.

## Капрызы квяцістай капусты



Каб вырасціць квяцістую капусту, трэба правільна выбраць гатунак. Калі вы спыніліся на гатунках і гібрыдах ранняга тэрміну выспявання, то перавагу лепш аддаць айчынным, якія добра прыстасаваны да ўмоў нашага клімату. Для фарміравання галоўкі такім гатункам неабходны 85—90 дзён з моманту з'яўлення ўсходаў.

На расаду квяцістую капусту сеюць за 45—60 дзён да пасадкі ў адкрыты грунт. Да з'яўлення ўсходаў тэмпературу падтрымліваюць на ўзроўні 20—22 градусаў. Затым яе зніжаюць, праветрываючы памяшканне, да 8—10 градусаў, каб прадухіліць выцягванне падсемядольнага калена. Паліў у гэты час трэба абмежаваць, а доступ святла — павялічыць.

Праз 10—12 дзён пасля з'яўлення ўсходаў расліны пікіруюць у асобныя гаршчочкі. Тэмпературу павышаюць да 16—18 градусаў у сонечнае надвор'е і на 12—14 градусаў у пахмурнае. Уначы паветра павінна праграваўцца не вышэй, чым 8—10 градусаў, інакш у капусты моцна разрастуцца лісты. Аптымальная вільготнасць паветра — 80 працэнтаў, глебы — 70 працэнтаў. Расада, вырашчаная пры ўмераных палівах, звычайна нявыцягнутая, моцная, каранастая.

Развіццю расліны і ўтварэнню галовак спрыяе позняе ўнясенне азотных угнаенняў. Пры тэмпературы паветра ніжэй, чым 10 градусаў лепш правесці падкормкі па лістах з апырскавальніка. Асабліва карысныя для квяцістай капусты мікраэлементы (бор, малібдэн), якія можна спалучаць з мінеральнымі ўгнаеннямі. Для апырсквання бяруць 10—15 г угнаення Кеміра-Універсал-2 і адну таблетку мікраэлементаў, разводзяць у 10 л вады і атрыманым растворам апрацоўваюць культуру, расходуючы па 0,5 л на 10 кв. м. Акрамя таго, трэба ўлічваць, што квяцістая капуста дрэнна пераносіць угнаенні, якія змяшчаюць хлор, а таксама яна не любіць кіслую глебу.

Хакей. КХЛ.

# Дагнаць «Лакаматыў»

### Сёння пастараецца «Дынама», якое пакуль саступае ў серыі 2:3

**Мінскае «Дынама» саступіла ў пятым матчы 1/8 фіналу розыгрышу Кубка Гагарына. І яраслаўскі «Лакаматыў» выйшаў наперад — цяпер лік у серыі да чатырох перамог стаў 3:2. Сёння ўвечары на «Мінск-Арэне» каманды правядуць шосты матч, і будзем спадзявацца, ён не стане для нас апошнім.**

Перад матчам у Яраслаўлі Марэк Сікора даў хакеістам дзень адпачынку і забараніў усім гульцам, якія ўдзельнічалі ў папярэднім матчы, выходзіць на лёд:

— Гэта псіхалагічна складана — кожны раз апранаць форму, канькі. Адзін дзень у гэтым плане нічога не вырашыць, але можа даць неабходны адпачынак, палепшыць настрой. Таму я вырашыў не нагружаць гульцоў, толькі веласіпеды, масаж, — сказаў галоўны трэнер напярэдадні паядынку.

Наша каманда і сапраўды ўпэўнена правяла матч і заслугоўвала перамогі. Але мінчане былі не такімі дакладнымі ў рэалізацыі момантаў, а падчас ім проста не шанцавала. За пяць секундаў да сірэны на першы перапынак лік адкрыў Петэр Падгарскі — дынамаўцы рэалізавалі большасць 5:3. А ў сярэдзіне другога перыяду большасцю скарыстаўся «Лакаматыў» — 1:1. Матч нельга назваць багатым на галявыя моманты, абедзве каманды гулялі ад абароны. Таму пераможцу вызначыў толькі авертайм — на яго пятай хвіліне Калянін вывеў яраслаўскі клуб наперад. Крыўдна, пра што і сказаў пасля гульні Петэр Падгарскі:

— Найперш пераважае пачуццё крыўды ад таго, што ўпусцілі перамогу ў матчы, які маглі выйграць.

Вось што сказаў пасля гульні Марэк Сікора:

— Сапраўды матч варты плэй-оф. На жаль, без нашай перамогі. Перад авертаймам сказаў хлопцам, што ў дадатковых перыядах многае вырашае іх пачатак. Трэба быць вельмі сабранымі, а ў нас не атрымалася. У астатнім камандай задаволены. Вядома, нам вельмі крыўдна. Бадай, нават больш крыўдна, чым пасля першага матчу серыі, прайгранага 4:7. Але самае складанае — апошні крок. Так што не раскісаем і рыхтуемся да чацвярговай гульні ў Мінску.

У нашай сталіцы «Лакаматыву» падрыхтаваная і сапраўды годная сустрэча — можна не сумнявацца, што на «Мінск-Арэне» ў чарговы раз будзе аншлаг, а магчыма, і чарговы рэкорд наведвальнасці. А наша каманда тым часам правядзе работу над памылкамі. Прынамсі, гэта паабяцаў капітан каманды Андрэй Міхалёў:

— У матчы мы шмат выдаляліся. Нам трэба выключыць гэтыя парушэнні і больш кідаць па варотах. Мы мала кідалі па варотах суперніка, у тым ліку і ў большасці. Але яшчэ нічога не скончана. Едзем у Мінск, будзем сур'ёзна рыхтавацца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# У гасцях у Соф'і Гальшанскай

### пабывалі ўдзельнікі выязнога пасяджэння клуба «Сустрэчы» Ашмянскай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы і госці з Мінска

Нечакана, ужо на самой імпрэзе, высветлілася, што выязное пасяджэнне клуба «Сустрэчы» Ашмянскай ЦБС у Гальшанскім Доме культуры праходзіла якраз у той дзень, калі 589 гадоў таму — 24 лютага 1422 года Соф'я Гальшанская ў Навагрудку брала шлюб з каралём польскім Ягайлам. Магчыма, гэтае супадзенне сталася знакавым, бо сустрэча прайшла надзвычай цікава, жыва, творча, была насычана карыснай інфармацыяй і выклікала ў прысутных шмат станоўчых эмоцый. Імпрэза была прысвечана гісторыі Гальшан і знакамітага Гальшанскага замка, гальшанскай князёўне Соф'і, якая разам з мужам стала пачынальніцай знанай каралеўскай дынастыі Ягелонаў-Ягайлавічаў, а таксама выхаду маёй кнігі «Каралева не здраджвала каралю».

Але не толькі Соф'я Гальшанская паспрыяла гэтаму. Стварэнню добрага настрою пастараліся найперш людзі, якія рыхтавалі сустрэчу. Гэта і прадстаўнікі ашмянскіх устаноў культуры на чале з начальнікам аддзела культуры райвыканкама Г.І. Балінскай, і бібліятэчныя работнікі пад кіраўніцтвам дырэктара раённай бібліятэкі М.Р. Белавус, і метадысты, якія разам з кіраўніком раённага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці А.П. Куст зрабілі сустрэчу непаўторнай па эмацыянальным і інфармацыйным насычэнні, і супрацоўнікі гальшанскіх Дома культуры і бібліятэкі, і шмат хто яшчэ. Аздобілі сустрэчу выдатным выкананнем песень удзельнікі мастацкай самадзейнасці з Ашмянскай дзіцячай школы мастацтва, Гальшанскага СДК, ансамбль народнай песні «Суполка» работнікаў культуры раёна.

Пра карысць сустрэчы можа сведчыць і той факт, што проста падчас імпрэзы старшыня Беларускага фонда культуры У.А. Гілеп аб'явіў прысутным аб рашэнні праводзіць пастаянны конкурс сярод жыхароў Гальшан на лепшы падворак. Арганізатарамі конкурсу будуць Беларускі камітэт міжнароднай рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС), Беларускі фонд культуры, мінскае прыватнае прадпрыемства «Нефпраект» і мясцовыя органы Гальшан. Пераможцы атрымаюць каштоўныя прызы, якія, магчыма, будуць уручаны ў дзень, калі споўніцца 590 гадоў з часу шлюбавання Соф'і Гальшанскай і Ягайлы.

**Анатоль БУТЭВІЧ.**

**ЗАВЕРЕНО**
*Департамент по ценным бумагам*
*Министерства финансов*
*Республики Беларусь*
*____________В.Г. Кулаженко*
*01.03.2011*

**УТВЕРЖДЕНО**
*ООО «Юнивест Консалтинг энд Трейдинг ГмбХ» (ФРГ)*
*(Решение № 27 от 09.02.2011 г.)*

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ СЕДЬМОГО ВЫПУСКА ИП «ЮНИВЕСТ-М»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

на белорусском языке:

полное: Замежнае прыватнае ўнітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства «ЮНІВЕСТ-М» ООО «ЮНІВЕСТ Консалтынг энд Трэйдынг ГмбХ;

сокращенное: ЗП «ЮНІВЕСТ-М»;

на русском языке:

полное: Иностранное частное унитарное производственно-торговое предприятие «ЮНИВЕСТ-М» ООО «ЮНИВЕСТ Консалтинг энд Трейдинг ГмбХ;

сокращенное: ИП «ЮНИВЕСТ-М».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Гикало, 3, телефон: (017) 2845954, телефон/факс: (017) 2845964, e-mail: univest_minsk@mail.ru.

**3. Основные виды деятельности эмитента**

**Эмитент в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и своим уставом осуществляет следующие виды деятельности (в соответствии с общегосударственным классификатором «Виды экономической деятельности»):**

- 0111 – выращивание зерновых, технических и прочих сельскохозяйственных культур, не включенных в другие группировки;
- 0112 – овощеводство, декоративное садоводство и производство продукции питомников;
- 0113 – выращивание фруктов, орехов, культур для производства напитков и пряностей;
- 0121 – разведение крупного рогатого скота;
- 0123 – разведение свиней;
- 1513 – производство мясных продуктов;
- 1532 – производство фруктовых и овощных соков;
- 1591 – производство дистиллированных алкогольных напитков;
- 1592 – производство этилового спирта из сброженных материалов;
- 1593 – производство виноградных вин;
- 1594 – производство сидра и прочих плодовых вин;
- 1595 – производство прочих недистиллированных напитков из сброженного материала;
- 1596 – производство пива;
- 1597 – производство солода;
- 1598 – производство минеральных вод и других безалкогольных напитков;
- 2320 – производство нефтепродуктов;
- 2411 – производство промышленных газов;
- 2416 – производство пластмасс в первичных формах;
- 2470 – производство искусственных и синтетических волокон;
- 2651 – производство цемента;
- 2652 – производство извести;
- 2653 – производство гипса;
- 2661 – производство изделий из бетона и извести для использования в строительстве;
- 2662 – производство гипсовых изделий для использования в строительстве;
- 2663 – производство товарного бетона;
- 2664 – производство сухих бетонных смесей;
- 2665 – производство изделий из асбестоцемента и волокнистого цемента;
- 2666 – производство прочих изделий из бетона, гипса и цемента;
- 2812 – производство строительных металлических изделий;
- 3612 – производство мебели для офисов и предприятий торговли;
- 4511 – разборка и снос зданий, земляные работы;
- 4521 – общестроительные работы;
- 4522 – устройство покрытий зданий и сооружений;
- 4523 – строительство дорог, аэродромов и спортивных сооружений;
- 4525 – прочие строительные работы;
- 4531 – электромонтажные работы;
- 4532 – изоляционные работы;
- 4533 – санитарно-технические работы;
- 4534 – установка прочего инженерного оборудования;
- 4550 – аренда строительного оборудования;
- 5050 – розничная торговля моторным топливом;
- 5112 – деятельность агентов по торговле топливом, рудами, металлами и химическими веществами;
- 5131 – оптовая торговля фруктами и овощами;
- 5132 – оптовая торговля мясом и мясными продуктами;
- 5134 – оптовая торговля алкогольными и другими напитками;
- 5135 – оптовая торговля табачными изделиями;
- 5137 – оптовая торговля кофе, чаем, какао и пряностями;
- 51382 – оптовая торговля хлебобулочными и макаронными изделиями, мукой и крупой;
- 51389 – оптовая торговля прочими пищевыми продуктами, не включенными в другие группировки;
- 51511 – оптовая торговля сырой нефтью и попутным газом;

51512 – оптовая торговля природным (горючим) газом;

- 51513 – оптовая торговля углем;
- 51514 – оптовая торговля торфом;
- 51515 – оптовая торговля бензином, керосином, дизельным топливом;
- 51516 – оптовая торговля мазутом топочным;
- 51519 – оптовая торговля смежными продуктами;
- 5155 – оптовая торговля химическими продуктами;
- 5188 – оптовая торговля сельскохозяйственными машинами;
- 51909 – неспециализированная оптовая торговля непродовольственными товарами;
- 5211 – розничная торговля в неспециализированных магазинах преимущественно пищевыми продуктами, включая напитки, и табачными изделиями;
- 5212 – прочая розничная торговля в неспециализированных магазинах;
- 5221 – розничная торговля фруктами и овощами;
- 5222 – розничная торговля мясом и мясными продуктами;
- 5223 – розничная торговля рыбой, ракообразными и моллюсками;
- 52242 – розничная торговля кондитерскими изделиями;
- 5225 – розничная торговля алкогольными и другими напитками;
- 5226 – розничная торговля табачными изделиями;
- 5227 – прочая розничная торговля пищевыми продуктами в специализированных магазинах;
- 5244 – розничная торговля мебелью и товарами для дома;
- 52630 – прочая розничная торговля вне магазинов;
- 5511 – предоставление услуг гостиницами с ресторанами;
- 5512 – предоставление услуг гостиницами без ресторанов;
- 5530 – предоставление услуг ресторанами;
- 5540 – предоставление услуг барами;
- 5552 – доставка готовой пищи;
- 6010 – деятельность железнодорожного транспорта;
- 6024 – деятельность автомобильного грузового транспорта;
- 6030 – транспортирование по трубопроводам;
- 6311 – транспортная обработка грузов;
- 6312 – хранение и складирование;
- 63213 – деятельность терминалов;
- 6330 – туристическая деятельность;
- 6340 – организация перевозок грузов;
- 7011 – подготовка к продаже недвижимого имущества;
- 7012 – покупка и продажа собственного недвижимого имущества;
- 7020 – сдача в наем собственного недвижимого имущества;
- 7031 – деятельность агентств по операциям с недвижимым имуществом;
- 7032 – управление недвижимым имуществом;
- 7110 – аренда автомобилей;
- 7121 – аренда прочих сухопутных транспортных средств и оборудования;
- 7132 – аренда строительных машин и оборудования;
- 7134 – аренда прочих машин и оборудования;
- 72300 – обработка данных;
- 7411 – деятельность в области права;
- 7414 – консультирование по вопросам коммерческой деятельности и управления;
- 74201 – деятельность в области архитектуры, инженерные услуги;
- 7430 – технические испытания и исследования;
- 7440 – рекламная деятельность;
- 7450 – наем рабочей силы и подбор персонала;
- 7460 – проведение расследований и обеспечение безопасности;
- 7482 – деятельность в области упаковки;
- 74850 – предоставление секретарских услуг и услуг по переводу;
- 7487 – предоставление прочих услуг потребителям;
- 93011 – стирка и обработка белья и других изделий;
- 9302 – предоставление услуг парикмахерскими и салонами красоты.

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка**

Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций эмитента (далее по тексту – облигации) будут поступать на счет эмитента № 3012407350019 (BYR), 3012407355014 (USD) в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) (адрес банка: г. Минск, Московская, 14), код 108, № 3012012370018 (BYR), 3012012370021 (USD) в ОАО «БПС-Банк» (адрес банка: г. Минск, бульвар имени В. Мулявина, д. 6), код 369.

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы эмитента за 2010 год и последующие годы подлежит публикации не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Звязда».

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием эмитента является депозитарий ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), код Депозитария – 016 (зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 07.10.1996 года, регистрационный номер 57), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385615 от 13.07.2007 года (Лицензия продлена на основании решения Министерства финансов Республики Беларусь от 13.07.2007 года № 243. Срок действия лицензии – до 29.07.2012 года).

**7. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

